


«Беларусь — гэта самая прыстойная краіна з усіх краін былога СССР», піша польская газета «Puls Biznesu». Аўтарытэтнае эканамічнае выданне сцвярджае, што карупцыя і адсталасць на нашай радзіме — гэта міф. СТАР 2



Хто адмовіцца займацца любімай справай і пры гэтым працаваць у зручны для сябе час? Як гэта зрабіць правільна? Аказваецца, зрабіцца рамеснікам можна ўсяго за дзень-два. СТАР 5



Каб стаць удзельнікамі першынства Еўропы па баскетболе, беларускай камандзе трэба двойчы перамагчы зборную Эстоніі. Што цікава, дапамагаць у дуэлі з прыбалтамі нашым хлопцам будзе... эстонец! СТАР 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЖНІЎНЯ 2013 г. ЧАЦВЕР № 156 (27521) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Гэта было падобна на сустрэчу старых знаёмых. Яны і сапраўды адзін аднаго добра ведаюць — людзі займаюцца адной справай, адной вялікай тэмай, якая стала галоўнай у іх працы. Яны даследуюць славянскую культуру. Культуры розных славянскіх краін. Таму каля канцэртнай залы «Мінск» яшчэ да пачатку з'езда гучалі цёплыя — і такія зразумелыя — вітанні на розных мовах. І па-беларуску. Што прыемна, што беларуская мова гучала і з вуснаў замежных навукоўцаў. І потым, ужо ў зале, яна стала дамінаваць. На ёй гаварылі акадэмікі і міністры — адукацыі Уладзімір Маскевіч і культуры Барыс Святлоў. Яна гучала з вуснаў мітрапаліта Мінска-Магілёўскага архіепіскапа Тадэвуша Кандрусевіча, які прывітаў з'езд ад імя касцёла. Яна гучала ў вітальным слове Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта. Вядома, узгадалі святкаванне ў гонар хрышчэння Русі. Успомнілі пра стварэнне славянскай пісьменнасці братамі Кірылам і Мяфодзіем. Ды прыгадалі традыцыі беларускага пісьменства...**








Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# ЧАСТКІ АДЗІНАГА

«Як відаць з праграмы з'езда, першая літаратурная мова славян — стараславянская, у аснову якой пакладзена мова нашых далёкіх продкаў — дрыгавічоў-дрыгавітаў, да гэтага часу прыцягвае ўвагу даследчыкаў усяго свету. Месца і роля славянскіх моў і літаратур у мінулым і сучасным свеце цікавіць не толькі вучоных славянскіх краін, але і шырокую навуковую грамадскасць ад Японіі да Злучаных Штатаў Амерыкі.

Нам асабліва прыемна адзначыць, што беларуская праблематыка традыцыйна займае значнае месца ў тэматыцы міжнародных з'ездаў славістаў, — адзначыў у сваім выступленні **прафесар Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ** як беларускі даследчык. І як старшыня Міжнароднага камітэта славістаў падкрэсліў, што наогул правядзенне Міжнароднага з'езда славістаў у Беларусі варта разглядаць як «прызнанне пэўных поспехаў славістыкі ў нашай краіне», якая засведчыла пра сябе яшчэ з часоў выдатнага даследчыка Яўхіма Карскага. Факт правядзення XV Міжнароднага з'езда славістаў значны для краіны: падзея можа даць новы стымул як для развіцця і пашырэння славістычных даследаванняў у нашай краіне, так і для прыцягнення ўвагі беларускага грамадства да праблем нацыянальна-культурнага жыцця дзяржавы ў XXI стагоддзі.

— На рубяжы стагоддзяў мы сутыкнуліся з феноменам істотнага пашырэння славянскай прасторы. З аднаго боку, інтэнсіўна пашыраецца славянская прысутнасць у неславянскіх краінах, што ставіць на парадак дня вывучэнне шляхоў уключэння славянскіх моў, культур і літаратур у неславянскае культурнае асяроддзе і іх захавання і развіцця ў гэтым асяроддзі, — сказаў Аляксандр Лукашанец. — З другога боку, відавочным фактам стала на рубяжы стагоддзяў так званае ўнутрыславянскае пашырэнне. Гэта звязана са з'яўленнем на карце Еўропы новых славянскіх дзяржаў, што непазбежна прывяло да фарміравання новых славянскіх літаратурных моў, новых славянскіх літаратур і культурнай дыферэнцыяцыі...

СТАР 4

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Намеснік начальніка Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Аляксандр ДУНЬКОВІЧ:**

***«Суму за шкоду, нанесеную прыродзе, плануецца павялічыць прыкладна ў 3 разы. Згодна з дзеючымі нормамі, памер нанесенага прыродзе ўрону за незаконную здабычу лася складае Br9,5 млн. Набыццё ў краме такой жа колькасці мяса абыдзецца браканьеру на парадак даражэй, чым аплата таксы. Атрымліваецца, што цяпер браканьерства выгадна. Мы прапанавалі павялічыць таксы настолькі, каб у браканьераў адпала жаданне страляць».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.08.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8920,00 | ■ |
| Еўра | 11950,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 270,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 1097,00 | ■ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 18° |
| Віцебск | + 25° |
| Гомель | + 27° |
| Гродна | + 18° |
| Магілёў | + 27° |
| Мінск | + 26° |

■ Погляд

# БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ НІЖНЯЙ ПЛАНЦЫ НА ЦТ?

*Аляксандр — выпускнік школы ўзору 2013 года. Будучую прафесію, як і многія яго сябры, стаў выбіраць бліжэй да заканчэння адзінаццатага класа. Але больш правільна будзе сказаць, што прафесійную будучыню хлопец вызначаў не самастойна, а за яго гэта зрабілі бацькі. Паколькі бацька Аляксандра яшчэ ў савецкія часы вучыўся ў радыётэхнічным інстытуце (цяперашнім БДУІР), то на сямейным савеце было вырашана, што і сын таксама пойдзе па той жа сцежцы — атрымліваць вышэйшую тэхнічную адукацыю. Тым больш што сам хлопец ніякіх сваіх прафесійных прыхільнасцяў так і не агучыў. БДУІР, БНТУ ці яшчэ нейкая ВНУ — для яго прынцыповай розніцы не існавала. Маўляў, куды бацькі скажуць, туды і пайду. Праўда, як высветлілася крыху пазней, для таго, каб стаць студэнтам БДУІР, трэба мець у сертыфікатах цэнтралізаванага тэсціравання не проста высокія, а вельмі высокія балы. Адным словам, па меры абнародавання арганізатарамі ЦТ вынікаў абітурыентаў надзея згасала літаральна на вачах. Па рускай мове і матэматыцы балы былі хоць і невысокія, але на платнае навучанне яшчэ можна было спадзявацца. А калі сталі вядомыя вынікі ЦТ па фізіцы, высветлілася, што Аляксандр трапіў у тыя самыя 37% удзельнікаў, якія не пераадолелі мінімальную планку. Такім чынам, пра вышэйшую адукацыю можна было забыцца. У якасці «запаснога аэрадрома» разглядаўся Вышэйшы радыётэхнічны каледж, куды не трэба было прадастаўляць сертыфікат па фізіцы. Але і там чакала расчараванне: балы Аляксандра не дазволілі яму прайсці нават на платнае навучанне. Між іншым, калі б Міністэрства адукацыі не павысіла ў гэтым годзе мінімальны парог на ЦТ, можна не сумнявацца, што ў якой-небудзь ВНУ абавязкова б знайшлася спецыяльнасць, куды хлопец прайшоў бы нават са сваімі баламі. А самае паказальнае ў гэтай гісторыі тое, што ніякіх іншых варыянтаў, акрамя атрымання вышэйшай адукацыі, у сям'і нават не разглядалася. І раптам (якая неспадзяванка!) двайны ўдар або двайны «пралёт» — спачатку міма ўніверсітэта, а затым — і міма каледжа.*

### Дэвальвацыя дыплома

Хацелася б нагадаць, што пасля адмены ў 2008 годзе ніжняга парогу для прэтэндэнтаў на студэнцкі білет многія хваляваліся: а ці не здарыцца так, што на студэнцкую лаўку змогуць трапіць уладальнікі самых нізкіх балаў, бо тэарэтычна прэтэндаваць на званне студэнта маглі ўсе ахвотныя, якія набралі на ЦТ 1 бал і больш. І ці не стане вышэйшая адукацыя даступнай усім ахвотным, асабліва тым, у каго ёсць сродкі, каб аплачваць сваё навучанне? І хоць у гэта калісьці мала верылася, тым не менш тэорыя пераўтварылася ў практыку. Пры наяўнасці свабодных месцаў прыёмныя камісіі не мелі права адмовіць абітурыентам у залічэнні, таму ў спісах залічаных сталі знаходзіць сябе ў тым ліку і выпускнікі, якія мелі ў школьных атэстатах «двойкі» па дзесяцібальнай шкале, і нават уладальнікі аднаго бала ў сертыфікатах.

СТАР 2

■ Сустрэча без абцасаў

# «СЯБРЫ КАЗАЛІ: «ЛЕРА, ЗНІМІ РУЖОВЫЯ АКУЛЯРЫ!»

**У кабінеце старшыні праўлення грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» Валерыі КЛІЦУНОВАЙ у вочы кінуўся партрэт Яўгена Будзінаса, які заснаваў музей старадаўніх рамёстваў у Дудутках. Пасля смерці мужа Валерыя распаўсюдзіла ідэю «Дудутак» на ўсю краіну. Сёння менавіта з прозвішчам гэтай незалежнай, рашучай, амбіцыйнай жанчыны звязана нараджэнне сельскага турызму ў Беларусі.**

### Пра млын, ружовыя акуляры і зялёнага пеўніка

**Складана было нават уявіць,** што я, карэнная гараджанка, некалі буду займацца адраджэннем вёскі. Але нарадзілася дзіця, і Будзінас набыў дом у Дудутках. Спачатку мы з дзіцем пераязджалі туды выключна на лета. Пасля таго, як муж стварыў паліграфічную фірму, атрымаў 200 гектараў зямлі і пачаў будаваць «Дудуткі», сама не заўважыла, як стала праводзіць у вёсцы 6 месяцаў у годзе. Гэта цяпер я ўспрымаю горад выключна як месца для працы. Сапраўднае жыццё для мяне пачынаецца за межамі горада. Большасць людзей з узростам таксама да гэтага прыходзіць.

**Партрэт** гэты (паказвае на сцяну) Будзінасу падарыў сам Уладзімір Стальмашонак. Намаляваў мужа мастак на фоне млына ў Дудутках невыпадкова. Бо ідэя зрабіць гэты музей належыць менавіта Будзінасу. Я, ужо будучы замужам, уцягнулася ў справу. Пісала экскурсіі, прываблівала турыстаў... Мы «раскруцілі» гэты ўнікальны аб'ект. Але пасля давялося ад яго пазбавіцца, можна сказаць, не па сваёй волі. У «Дудутак» цяпер новы гаспадар. Ён, нічога не магу сказаць, развівае музей, досыць шмат укладвае ў інфраструктуру, уводзіць новыя аб'екты. Я шчыра радуюся, што дзецішча Будзінаса жыве і карыстаецца папулярнасцю.

СТАР 3



## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ЛАТВІІ АНАНСАВАЛІ СТВАРЭННЕ ЦЫГАНСКІХ ПАСЁЛКАЎ

Цыганскія пасёлкі могуць з'явіцца ў Латвіі ўжо ў 2016 годзе. Пра гэта ў эфіры «Латвійскага Радыё-4» заявіў вярхоўны камісар міжнароднага саюза цыганоў Нормунд Рудзевіч. Ён перакананы, што гэтая ідэя дапаможа захаваць цыганскую супольнасць, мову і культуру.

Жыхары такіх паселішчаў, па словах Рудзевіча, маглі б займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю — напрыклад, здабычай торфу і сапрапелю або глыбокай замарозкай прадуктаў харчавання. Пры гэтым яны павінны будуць прытрымлівацца цыганскіх законаў і падпарадкоўвацца радзе старэйшын. Рэалізаваць праект плануецца на грошы еўрапейскіх фондаў. Паводле інфармацыі Рудзевіча, усяго на тэрыторыі Латвіі можа быць створана тры-чатыры цыганскія пасёлкі. З 2007 па 2012 гады Еўрасаюз выдзеліў на праграмы па памяншэнні сацыяльнай адчужанасці цыганоў у Латвіі каля аднаго мільёна латаў (1,4 мільёна еўра).

### ТУФЛІ НА АБЦАСЕ МОЦНА ШКОДЗЯЦЬ НАГАМ

Вядома, што абутак на высокім абцасе негатыўна ўплывае на здароўе жаночых ног. Па словах хірурга-артапеда з Каралеўскага нацыянальнага артапедычнага шпіталя ў Стэнмары Эндзі Голдберга, у такім абутку ўся вага цела пераносіцца на пальцы ног. Гэта пагражае развіццём артрыту, утварэннем гузоў на пальцах і адхіленнем, вядомым як кіпцюрыстыя пальцы, піша News Track India. Голдберг выкарыстаў спецыяльны сканар, каб зразумець рэальную ступень пашкоджанняў, выкліканых нашэннем абутку на абцасе. Аказалася, пашкоджанні значна складаней і цяжэй, чым меркавалася раней. Такім чынам, пры наяўнасці высокага абцаса пальцы здушваюцца ў туфлях.

Ступень пашкоджанняў напрамую залежыць ад таго, наколькі вузкі насок на абутку. Голдберг падкрэслівае: абутак на абцасе можна насіць на працягу 1-2 гадзін. Але калі жанчына носіць яго на працягу васьмігадзіннага працоўнага дня (і гэта працягваецца шмат гадоў), то яе адназначна чакаюць праблемы.



ISSN 1990 - 763X

1 5 1 5 6

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### АД ААН ЗАПАТРАБАВАЛІ ПРАВЕРЫЦЬ ІНФАРМАЦЫЮ АБ ХІМІЧНАЙ АТАЦЫ Ў СІРЫІ



Генеральны сакратар Лігі арабскіх дзяржаў Набіль аль-Арабі запатрабаваў ад інспектараў ААН па хімічнай зброі, якія працуюць у Сірыі, неадкладна праверыць паведамленні аб масіраванай хімічнай атацы ў прыгарадах Дамаска, паведамляе Agence France-Presse. На думку аль-Арабі, інспектары павінны тэрмінова адправіцца ў раён Усходняя Гута, дзе, па паведамленнях відавочцаў, не менш за 650 чалавек былі забіты нейкім нервова-паралітычным газам.

Лідары сірыйскай апазіцыі, якая дзейнічае за межамі краіны, запатрабавалі тэрміновага склікання Савета бяспекі ААН для абмеркавання сітуацыі, якая склалася. На аматарскіх відэакадрах, прадэманстраваных у прамым эфіры тэлеканала «Аль-Джазіра», былі паказаны сотні мёртвых людзей, сярод якіх было мноства дзяцей і жанчын, без бачных пашкоджанняў на целе. На запісах з мясцовых бальніц паказалі людзей з пенай ля рота, якія б'юцца ў канвульсіях і задыхаюцца. Сярод гэтых пацыентаў таксама шмат дзяцей. Сірыйскі ўрад абверг звесткі аб выкарыстанні хімічнай зброі ў прыгарадах Дамаска. Дзяржаўнае тэлебачанне назвала распаўсюджванне гэтай інфармацыі правакацыяй.

КОРАТКА

У Мытным саюзе ўводзіцца часовая ўвазная пошліна на асобныя віды гадзіннікаў. У адпаведнасці з гэтым рашэннем яна складзе 10 працэнтаў ад мытнага кошту, але не менш як 4 еўра за 1 шт.

Фестываль сярэдневяковай культуры «Гальшанскі замак-2013» пройдзе каля сцен легендарнага замка ў Ашмянскім раёне 24 жніўня.

У лясным масіве Верхнядзвінскага раёна заблукалі двое грыбнікоў. Да вечара аднаму з мужчын удалося выйсці да людзей, пошукі другога працягнуліся і на наступны дзень. Знайсці гора-грыбніка атрымалася дзякуючы прафесіяналізму інструктара службовых сабак аддзела памежнай службы «Верхнядзвінск». Мужчыну, які заблукаў, выявіла нямецкая аўчарка Іраклі.

У гэтым годзе 6 тыс. 261 замежны грамадзянін прыцягнуты на працу ў Мінск па працоўных дагаворах. Большасць замежнікаў, якія працуюць у Мінску, — грамадзяне Кітая (33% агульнай колькасці), Узбекістана, Літвы, Латвіі, Турцыі. Каля 70% замежнікаў, якія прыехалі на працу ў Мінск, занятыя ў будаўнічай сферы.

■ Вопытным шляхам

# ВЯЧЭРА НЕ «ПА-НАШАМУ»...

## Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала высветліць, як пачувае сябе іншаземны госць у беларускіх кавярнях

**Праз некалькі месяцаў беларускую сталіцу напоўняць турысты з усяго свету, якія прыедуць назіраць за гульнямі чэмпіянату свету па хакеі — 2014. Толькі вось, акрамя відовішчаў, кожны чалавек рана ці позна няўмольна пачынае хацець і «хлеба». У Мінску ёсць дзе пачаставацца. Але ці так проста гэта атрымаецца ў іншаземца, які не гаворыць ні на беларускай, ні на рускай мовах? Каб высветліць гэта, мы вырашылі правесці невялічкі эксперымент. Дапамагчы згадзілася Дзіна Грыцкевіч, спецыяліст па міжкультурнай камунікацыі ў сферы міжнароднага турызму і перакладчык. Яна ў вобразе турысткі з Германіі наведала некалькі папулярных сталічных кавярняў і падзялілася сваімі ўражаннямі ад убачанага...**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### «Бедныя іншаземцы...»

...У маёй сумцы ляжыць дыктафон і прыкладныя варыянты пытанняў для афіцыянтаў, а ў душы — не надта прыемнае хваляванне. А раптам яны ўсё зразумеюць? Вось і канец эксперыменту! З гэтымі адчуваннямі я перадаю дыктафон і лісток Дзіне і тлумачу «план дзеянняў». Мы ўваходзім ва ўсе кавярні асобна, сядаем за розныя столікі, але з такой умовай, каб добра бачыць адна адну. Дзіна трымае ўключаны дыктафон у сваёй сумцы, што б ні здарылася, іграе ролю іншаземнай турысткі да апошняга. А я дзесьці побач назіраю за ўсім гэтым і, па магчымасці, фатаграфую. Мая «калега па эксперыменце» свабодна валодае нямецкай і англійскай мовамі. Мы вырашылі, што Дзіна будзе турысткай з Германіі, якая крыху размаўляе па-англійску...

СТАР 3

■ Май на ўвазе

## УЯЗНЫЯ ВІЗЫ ДЛЯ ІНШАЗЕМЦАЎ — У АЭРАПОРЦЕ

**З мэтай аблегчыць парадак выдачы віз у Нацыянальным аэрапорце Мінск, у адпаведнасці з пастановай Саўміна №725 ад 16 жніўня аб унясенні змяненняў у Візавыя правілы Рэспублікі Беларусь, з 22 жніўня ўсе замежныя грамадзяне, што прыбываюць у нашу краіну праз названы аэрапорт, будуць мець магчымасць атрымання ўязных віз тут жа на месцы.**

Разам з тым, Міністэрства замежных спраў звяртае ўвагу на захаванне патрабавання загадзя прадастаўляць ва ўпраўленне па пытаннях уезду іншаземцаў галоўнага консульскага ўпраўлення міністэрства дакументы візавай падтрымкі, неабходных для афармлення ўязных віз.

У прыватнасці, для афармлення кароткатэрміновых уязных віз — не пазней чым за тры працоўныя дні да мяркуемай даты прыбыцця замежнага грамадзяніна, а для доўгатэрміновых — не пазней чым за пяць дзён да мяркуемай даты прыбыцця. У сувязі з цяжкім захворваннем ці смерцю блізкага сваяка ці члена сям'і іншаземца дакументы візавай падтрымкі могуць быць прадастаўлены ў момант звароту іншаземца па візу.

Дакументы візавай падтрымкі могуць быць прадастаўлены самастойна ва ўпраўленне па пытаннях уезду іншаземцаў галоўнага консульскага ўпраўлення Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, якое знаходзіцца ў Нацыянальным аэрапорце Мінск (кантактны тэлефон: +375 17 279 20 58) або па пошце з улікам тэрмінаў дастаўкі (220054, г. Мінск, тэрыторыя Нацыянальнага аэрапорта Мінск, упраўленне па пытаннях уезду іншаземцаў галоўнага консульскага ўпраўлення Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь).

Афармленне кароткатэрміновых уязных віз у мэтах вучобы вядзецца толькі пры наяўнасці ў Нацыянальным аэрапорце Мінск прадстаўніка арганізацыі, якой у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь прадастаўлена права выдаваць запрашэнні на навучанне.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

## ДАЎГАБУДАМ — АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ

**У Камітэце дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці ўзялі на асаблівы кантроль пытанне здачы «пад ключ» даўгабудаў.**

Пастаянна ажыццяўляецца кантроль за ходам будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў, якія ўзводзяцца з парушэннем нарматыўных тэрмінаў, а таксама за якасцю будаўніцтва жылля. У выніку прыняцця дадатковых мер у ліпені быў поўнасцю дабудаваны ў мікрараёне «Білева-2» Віцебска жылы дом. Дазвол на ўзвядзенне гэтага дома ў інспекцыі Дзяржбуднагляду быў атрыманы яшчэ ў жніўні пазамінулага года. Заказчыкам выступіла прадпрыемства «Капітальнае будаўніцтва горада Віцебска», падрадчыкам — Віцебскі домабудаўнічы камбінат. Нарматыўны тэрмін будаўніцтва скончыўся ў сакавіку мінулага года. А на пачатак сёлетняга чэрвеня будаўнічая гатоўнасць жылога дома складала прыкладна 60%.

Для заканчэння работ на аб'екце ў чэрвені і ліпені былі задзейнічаны дадатковыя рабочыя будаўнічай арганізацыі, што дазволіла завяршыць усе работы за 2 месяцы. У мэтах выключэння фактаў неналежнай якасці будаўніцтва прыёмка ў эксплуатацыю гэтага жылога дома ажыццяўлялася пад кантролем нашых супрацоўнікаў.

Раней дзякуючы ўмяшанню рэвізораў было завершана будаўніцтва 57-кватэрнага жылога дома ў Браславе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Вачамі замежнікаў

# «БЕЛАРУСЬ — ГЭТА САМАЯ ПРЫСТОЙНАЯ КРАІНА З УСІХ КРАІН БЫЛОГА СССР»

**Так зусім нядаўна назвалі нашу краіну ў польскай газеце «Puls Biznesu». Аўтарытэтнае эканамічнае выданне сцвярджае, што карупцыя і адсталасць на нашай радзіме — гэта міф. На прыкладзе развіцця Ідэя Банка (былы Сомбелбанк), які 6 гадоў таму купіў польскі бізнесмен Лешэк Чарнецкі, і апытання кіраўнікоў некалькіх кампаній, што працуюць на беларускім рынку, газета паказвае перавагі і недахопы вядзення бізнесу ў Беларусі.**


Puls Biznesu
Spółki osobowe założysz online
Białoruska ziemia obiecana
Korupcja i zacofanie to mit. Biznes na Wschodzie idzie Polakom jak po maśle. Idea Bank z grupy Getinu zarabia tam jak giganci ▸ 4-5
Bary mleczne: reaktywacja

### Польскія грошы добра растуць на беларускай глебе

Ідэя Банк пачаў сваё інтэнсіўнае развіццё з 21 месца сярод усіх банкаў краіны. Цяпер па сумарных актывах банк заняў 12 месца ў галіне. А па прыбытковасці ён увогуле шосты. Сакрэт паспяховасці раскрывае Крыштаф Спыра, адказны за беларускі бізнес ад імя кампаніі «Getin Holding»: «Выйшлі з такой прапановай, якой ні ў каго не было на рынку. Раней, калі хтосьці хацеў атрымаць крэдыт у банку, чакаў разгляду заяўкі некалькі дзён. У Ідэя Банку рашэнне прымаецца на працягу гадзіны. Пасля кліент атрымлівае картку, з якой можа ўзяць крэдыт у найбліжэйшым банкамаце». У выніку справы ідуць нядрэнна. Аб тым жа гаворыць факт, што Лешэк Чарнецкі ўжо падпісаў папярэдняе пагадненне аб куплі яшчэ аднаго банка — «Беларускага Банка Малога Бізнесу». Акрамя таго, кампанія «Getin» падумвае аб запуску ў Беларусі лізінгу, на якім спецыялізуецца на ўсходніх рынках, а таксама страхавой кампаніі.

Польскі бізнес добра пачувае сябе на Беларусі яшчэ і таму, што з'яўляецца вельмі гнуткім, у адрозненне ад банкаў з расійскім ці нават аўстрыйскім капіталам. Такога меркавання прытрымліваецца Кшыштаў Спыра.

### Рынак бяспечны, але са слабай канкурэнцыяй

У той жа час не ўсё так проста на беларускім рынку. Тое, што на яго дастаткова лёгка ўвайсці (калі ты знаходлівы і маеш вялікі капітал), таксама мае недахопы. Ва ўсялякім разе для самой Беларусі. На нашым рынку занадта слабая канкурэнцыя. Аб гэтым гаворыць Веслаў Пакладэк, першы саветнік Пасольства Рэспублікі Польшча ў Беларусі. Ён жа сцвярджае, што насуперак папулярнаму меркаванню бізнес у Беларусі з'яўляецца бяспечным: «...няма палітыкі, арыентаванай на пераследаванне замежных прадпрымальнікаў, бо ёсць разуменне пераваг, якія атрымлівае эканоміка». Аднак аб вядзенні бізнесу на аснове прыватызаванай маёмасці паляк выказваецца ў іншым ключы. Ён лічыць, што прыватызацыя развіта недастаткова і ў такім выпадку ў бізнесе могуць узнікаць цяжкасці.

### Высокая тэхнічная культура і адсутнасць карупцыі

Польскія фірмы, якія добра ведаюць беларускі рынак, лічаць яго добразычлівым. «Я б параіў весці бізнес у Беларусі. Польскі капітал павінен інвеставаць і выходзіць за мяжу, а для нас Беларусь — гэта натуральны кірунак развіцця», — лічыць Яцэк Міхалак, віцэ-прэзідэнт па развіцці групы «Атлас». Яму толькі не падабаюцца доўгія простоі на мяжы: «Мы імпартуем шмат сыравіны з Польшчы, таму гэта займае шмат часу».

У нашай краіне частку прадукцыі прадае група «Vox», вытворца мэблі і профіляў. Яе дырэктар Пётр Віт Волькел запэўнівае, што вядзенне бізнесу ў Беларусі нашмат лепш, чым у Расіі. Як ён сцвярджае, гэта арганізаваная краіна і ў ёй няма месца карупцыі. Іншыя прадпрымальнікі гэтае меркаванне падзяляюць. «Беларусь — гэта самая прыстойная краіна з усіх краін былога СССР». Яна можа пахваліцца высокай тэхнічнай культурай, што для інжынернай фірмы, такой, як наша, азначае, што мы можам працаваць з кампетэнтнымі людзьмі. Краіна закрытая, але не карумпіравана. Беларусы вытрымліваюць бар'ер, які стварылі, каб абараніць рынак», — распавядае Адам Жураўскі, дырэктар фірмы «Аплісэнс», якая ўжо 10 гадоў існуе ў Беларусі. Ён увогуле лічыць, што прысутнасць у Беларусі — гэта «шчыліна» ў іншыя краіны СНД. Адам Жураўскі прызнае, што пасля крызісу ў 2011 годзе беларускі рынак звузіўся, але цяпер эканоміка зноў развіваецца.

Крызіс адчула і кампанія «Feerum». Аднак яе дырэктар Даніэль Януш заяўляе, што «мы не адмовімся ад Беларусі, бо ў ёй ёсць вялікі патэнцыял».

**Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, па матэрыялах газеты «Puls Biznesu»**

■

■ Сезон нарыхтовак

# «ДРУГІ ХЛЕБ» ПАЕДЗЕ Ў КАЗАХСТАН...

**А таксама ў Расію, якая традыцыйна з'яўляецца галоўным пакупніком, у Сербію і Кыргызстан. На экспарт беларускай бульбы ўжо заключаюцца дамовы. Пра гэта паведаміў журналістам начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН.**

Пра аб'ёмы экспарту пакуль гаварыць рана, бо значная частка ўраджаю яшчэ не сабрана. Бульбу, між іншым, вырошчваюць у нашай краіне на тэрыторыі ў 52 тысячы гектараў. Сховішчы для гародніны, якія ёсць у Беларусі, здольныя змясціць 845 тысяч тон гэтай культуры.

— У гэтым сезоне ўжо нарыхтавана 89,3 тысячы тон гародніны, — таксама адзначыў Уладзімір Гракун. — Асноўная маса — агуркі і памідоры, што выраслі пераважна ў закрытым грунце. У хуткім часе пачнецца збор ураджаю цыбулі, якой плануецца атрымаць 60 тысяч тон.

Сёлета ў першым паўгоддзі арганізацыямі гандлю прададзена больш за 109 тысяч тон гародніны. Прадукцыя айчыннай вытворчасці, што была рэалізавана за вышэйзгаданы перыяд, складае 79,4% ад агульнай колькасці. Летась на душу насельніцтва гародніны і бахчавых культур «прыпала» 145 кілаграмаў. Да 15 лістапада ў Беларусі плануюць завяршыць закладку запасаў гародніны і садавіны на зіму. Так, бульбы на міжсезонны перыяд будзе нарыхтавана 66,5 тысячы тон, капусты — 35,4 тысячы тон, морквы — 17,5 тысячы тон, чырвоных буракоў — 13,1 тысячы тон, 4 тысячы тон цыбулі. Што датычыцца яблыкаў, то іх плануюць нарыхтаваць 19,8 тысячы тон. Да 15 верасня будуць вызначаны гранічныя закупачныя цэны, а гранічныя адпускныя цэны на прадукцыю раслінаводства стануць вядомымі пасля 15 лістапада.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■

# БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ НІЖНЯЙ ПЛАНЦЫ НА ЦТ?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Калі стала зразумелым, што вышэйшая адукацыя рызыкуе стаць не проста масавай, а ўсеагульнай, было прынята рашэнне зноў вярнуць «шлагбаум» на ўваходзе ў ВНУ. Летась самая вялікая колькасць абітурыентаў, якія не здолелі пераадолець устаноўлены парог у 7 балаў, здавалі тэсты па фізіцы і матэматыцы (да 10 працэнтаў ад агульнай колькасці). Падводзячы вынікі прыёмнай кампаніі 2012 года, першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Жук папярэдзіў, што мінімальны парог на цэнтралізаваным тэсціраванні будзе павышацца: «Хутчэй за ўсё, спынімся на 10 балах. Гэта будзе сігнал і моладзі, і грамадству, што ў далейшым патрабаванні на ўступных іспытах будуць расці. Падняўшы ніжнюю планку адразу ўдвая, мы проста рызыкуем недабраць абітурыентаў па звышзапатрабаваных рынкам працы спецыяльнасцях».

> **«Калі вышэйшая адукацыя становіцца фактычна ўсеагульнай, гэта непазбежна прыводзіць да рэзкага зніжэння яе якасці і дэвальвацыі дыплома. І тут ужо заканамерна ўзнікае іншае пытанне: а ці патрэбна на рынку працы столькі людзей з вышэйшай адукацыяй?»**

І ўсё ж такі ніжняя планка на ЦТ па матэматыцы, фізіцы, хіміі і біялогіі ўзнялася адразу да 15 балаў і да 20 балаў — на ЦТ па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі найноўшага часу, грамадазнаўстве, геаграфіі і замежных мовах. Кіраўніцтва Міністэрства адукацыі патлумачыла, што станоўчыя значэнні тэставых балаў вызначаліся з улікам аналізу вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання за два апошнія гады. Аналізаваўся працэнт выканання заданняў у тэстах, узровень складанасці заданняў, а таксама праводзіўся аналіз вынікаў конкурснага адбору ва ўстановы вышэйшай адукацыі за два папярэднія гады.

— Мы ўпэўнены, што ўстаноўлены мінімальны ўзровень тэставых балаў дазволіць не прапусціць у кола студэнтаў слаба падрыхтаваных абітурыентаў. Па нашых папярэдніх падліках, каля 30% абітурыентаў могуць не дасягнуць гэтага парога. Затое яны змогуць працягнуць навучанне ў прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, — агучваў пазіцыю галоўнага адукацыйнага ведамства яго кіраўнік.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### «Страты» пасля ЦТ

Шчыра кажучы, у Міністэрстве адукацыі моцна рызыкавалі, паколькі колькасць месцаў у ВНУ перавышала колькасць выпускнікоў гэтага года. І, у першую чаргу, пад пагрозай аказалася платная форма навучання ў ВНУ. Але пасля заканчэння прыёмнай кампаніі высветлілася, што незапоўненымі засталіся ў вышэйшых навучальных установах не толькі платныя (у некаторых ВНУ недабор на платную форму навучання дасягнуў амаль 90%) , але і 1 767 бюджэтных месцаў. Для параўнання: у 2012 годзе не ўдалося запоўніць на дзённай бюджэтнай форме навучання 200 бюджэтных месцаў, або каля 2% ад кантрольных лічбаў прыёму — у асноўным на спецыяльнасцях педагагічнага профілю. З запаўненнем педагагічных спецыяльнасцяў узнікалі праблемы і ў гэтым годзе. Але, з іншага боку, цяжка ўявіць сабе, чаму змог бы навучыць школьніка педагог, які сам не ведае матэматыку на элементарным узроўні або не знаёмы з фізічнымі законамі. Між іншым, у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт у папярэднія гады прыходзілі абітурыенты з вельмі нізкімі баламі ў сертыфікатах (2, 3, 4, 5 і 6 балаў)... Шмат выпадкаў было, калі атэстат літаральна «выцягваў» абітурыента, дазваляў яму наблізіцца да прахаднога бала: у агульнай суме балаў будучага студэнта яго «вага» была вырашальнай.

Вынікі цэнтралізаванага тэсціравання 2013 года наступныя. Удзел у іспытах узялі 113 448 чалавек. Не пераадолелі ніжні парог тэставага бала, устаноўлены для прэтэндэнтаў на атрыманне вышэйшай адукацыі, 40 682 чалавекі, або 35,86% ад агульнай колькасці ўдзельнікаў ЦТ. З іх 2064 абітурыенты не набралі мінімальны бал адразу па трох (!) вучэбных прадметах, 11 454 — па дзвюх дысцыплінах і 27 164 па адной вучэбнай дысцыпліне. Пасля тэсціравання па матэматыцы з прыёмнай кампаніі выбыў кожны трэці ўдзельнік ЦТ. Яшчэ больш абітурыентаў не вытрымалі іспытаў па фізіцы...

**Сёння галоўная інтрыга заключаецца ў тым, што будуць далей рабіць з ніжняй планкай на ЦТ?** Калі стала вядома, колькі абітурыентаў сышло з дыстанцыі пасля цэнтралізаванага тэсціравання, у многіх «нешчасліўцаў» яшчэ захоўвалася надзея, што Міністэрства адукацыі адменіць або перагледзіць ніжні парог. Але гэтага не адбылося: устаноўленыя «правілы гульні» змяняць у разгар прыёмнай кампаніі не сталі. І правільна зрабілі, паколькі тэсты і так ужо за апошнія гады максімальна спрасцілі... Сведчанне таму — высокая колькасць уладальнікаў максімальных балаў і надзвычай вострая канкурэнцыя паміж імі на асабліва прэстыжных у моладзі спецыяльнасцях.

### На аднаго работніка — два начальнікі?

У чым асабіста я бачу галоўны плюс ад увядзення ніжняй планкі на цэнтралізаваным тэсціраванні, дык гэта ў тым, што яна дазваляе адсеяць выпадковых людзей. Не сакрэт, што зручнасць тэставай формы экзаменаў прыцягвае шмат аматараў злавіць удачу. А раптам і пашанцуе? Адна рэч — паставіць наўдачу адказы ў тэстах ці ўвогуле здаць экзаменатарам чысты бланк, распісаўшыся ва ўласнай бездапаможнасці, і зусім іншая — зняславіць сябе перад экзаменацыйнай камісіяй.

Калі яшчэ 20 гадоў таму на вышэйшую адукацыю адважваліся замахнуцца толькі 20-30 працэнтаў выпускнікоў агульнаадукацыйных школ, то цяпер усе масава ідуць удзельнічаць у цэнтралізаваным тэсціраванні... А калі вышэйшая адукацыя становіцца фактычна ўсеагульнай, гэта непазбежна прыводзіць да рэзкага зніжэння яе якасці і дэвальвацыі дыплома. І тут ужо заканамерна ўзнікае іншае пытанне: а ці патрэбна на рынку працы столькі людзей з вышэйшай адукацыяй? І ці не наспеў час, прывесці план прыёму ў ВНУ ў адпаведнасць з дэмаграфічнай сітуацыяй у краіне?

> **«Кожная ВНУ павінна сама вызначаць для сябе ніжнюю планку. Нельга зноў даводзіць да ўсіх адзіную лічбу: трэба ўлічваць і спецыфіку ВНУ, і попыт на рынку працы на тых ці іншых спецыялістаў».**

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Анатоль Рубінаў неяк трапна заўважыў, што колькасць тых, хто паступіў у ВНУ, у нас амаль удвая перавышае колькасць тых, хто атрымлівае адукацыю ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах: «Атрымліваецца, што на аднаго работніка ў нас будуць два начальнікі?»

**Ёсць меркаванне, што мінімальны парог на ЦТ варта ўвесці толькі для тых абітурыентаў, хто прэтэндуе на бюджэтныя месцы.** Калі ж чалавек гатовы плаціць за сваю адукацыю і нейкая ўстанова вышэйшай адукацыі гатова паспрабаваць яго навучыць, то немэтазгодна забараняць яму вучыцца. Іншая справа, што калі студэнт не зможа засвойваць праграму вышэйшай школы, то трэба адлічваць яго без шкадавання.

А вось з гэтай думкай можна паспрачацца. Людзі, гатовыя плаціць за сваё навучанне, — пажаданыя госці не толькі ў прыватных ВНУ, дзе яны з'яўляюцца фактычна адзінай крыніцай іх існавання, але і ў дзяржаўных, якім даводзяцца планы па аказанні платных паслуг. Дастаткова паглядзець на прахадныя балы на платнай форме навучання, якія могуць адрознівацца ад прахаднога бала «на бюджэце» на сотню адзінак. Калі не запаўняюцца месцы на платнай форме навучання, значыць, не выконваюцца даведзеныя лічбы па платных паслугах і выкладчыкаў трэба скарачаць, а адлічваць студэнтаў-платнікаў — значыць губляць грошы. Такім чынам, відавочная супрацьлегласць інтарэсаў: з аднаго боку, платная форма навучання дапамагае фінансава падтрымліваць ВНУ, а з іншага боку — за яе мы вымушаны расплачвацца нізкай якасцю падрыхтоўкі кадраў.

Упэўнена, што калі бацькі атрымалі магчымасць аплачваць сваім дзецям навучанне, многія з іх у прамым сэнсе страцілі пільнасць, бо маючы «тройкі» і «чацвёркі» ў школе, дзеці былі павінны паступаць не ў ВНУ, а падумаць пра атрыманне рабочай прафесіі. Што ж атрымліваецца з «двоечнікаў» у ВНУ? Безумоўна, многіх адлічваюць. Часта ў якасці прыкладу прыводзяць еўрапейскія краіны, дзе на першы курс прымаюць усіх ахвотных, а на працягу навучання няздольныя да вучобы самі адсейваюцца. Але ў нас наўрад ці хтосьці маральна гатовы для адлічэння. Тым больш, куды пойдзе адлічаны пасярод навучальнага года? А калі яму 17 гадоў? Ці калі ён сірата? Таму лёгка сказаць: «Адлічыць!». Трэба помніць, што за кожным такім адлічэннем стаіць вельмі малады чалавек, якому зноў выпадае апынуцца на раздарожжы.

Не сумняваюся, што на ўваходзе ў ВНУ павінен быць нейкі бар'ер, які б прымусіў абітурыентаў напружвацца. Але, на мой погляд, кожная ВНУ павінна сама вызначаць для сябе ніжнюю планку. Нельга зноў давесці да ўсіх адзіную лічбу: трэба ўлічваць і спецыфіку ВНУ, і попыт на рынку працы на тых ці іншых спецыялістаў, і тую акалічнасць, хто рэальна зможа засвоіць вучэбную праграму, бо не заўсёды і не ўсіх студэнтаў можна падцягнуць па школьнай праграме. Напэўна, гэта будзе не па-дзяржаўнаму — спачатку залічваць усіх ахвотных, а затым адсейваць няўдачнікаў пасля экзаменацыйных сесій. 19 тысяч адлічаных за адзін навучальны год — пагадзіцеся, значная лічба...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## РЭВІЗОРЫ СЭКАНОМІЛІ 247,7 МІЛЬЯРДА

**Сёлета толькі ў першым паўгоддзі ў выніку дзейнасці Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці сэканомлена 247,7 млрд руб. дзяржаўных сродкаў — у 3,7 раза больш, чым летась. Спагнана ў кансалідаваны бюджэт рэспублікі 27,6 млрд руб. Пастаўлена на ўлік аб'ектаў на суму 62,7 млрд руб.**

— Забяспечаны ўзважаны з улікам ступені віны і фінансавага становішча падыход пры накладанні адміністрацыйных спагнанняў. У прыватнасці, накладзена спагнанняў на суму 5,8 млрд руб. (пры ўстаноўленым заканадаўствам максімальным памеры штрафаў 12,9 млрд руб.). Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі 263 парушальнікаў, да дысцыплінарнай — 387, — канстатавалі ў кантрольным ведамстве.

Сёлета (Год беражлівасці) будзе актывізавана правядзенне комплексных кантрольна-аналітычных мерапрыемстваў па выяўленні рэзерваў эканоміі матэрыяльных і паліўна-энергетычных рэсурсаў, законным і эфектыўным выкарыстанні сродкаў бюджэту пры рэалізацыі дзяржаўных праграм, інавацыйных праектаў, своечасовым вяртанні ў краіну валютнай выручкі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У ЗАБОЙСТВЕ ЛУЧНІЦЫ ПАДАЗРАЕЦЦА ЯЕ БЫЛЫ МУЖ

**27-гадовую мінчанку, якая займалася стральбой з традыцыйнага лука і ўзначальвала клуб «Ліга Вольных Стралкоў», знайшлі забітай. Астанкі яе цела ў некалькіх поліэтыленавых пакетах дасталі 20 жніўня з Цнянскага вадасховішча. У забойстве дзяўчыны падазраецца яе былы муж, паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Георгій ЕЎЧАР.**

14 жніўня з заявай аб знікненні Ганны Сардэчкінай у Фрунзенскае РУУС сталіцы звярнуўся яе былы муж. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку правялі комплекс мерапрыемстваў. Сабраныя доказы былі не на карысць заяўніка. У выніку мужчына вымушаны быў прызнацца, што задушыў маці свайго маленькага сына, расчляніў труп і адвёз яго на Цнянскае вадасховішча.

Упраўленне Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Мінску шукае кіроўцу легкавога аўтамабіля, які падвозіў высокага маладога мужчыну з некалькімі буйнымі сумкамі позна вечарам 12-га або ў ноч на 13 жніўня ад вуліцы Народнай да вуліцы Лук'яновіча ў Мінску. І пераканаўча просіць яго і іншых магчымых відавочцаў патэлефанаваць па наступных тэлефонах: (044) 500 31 09, (017) 395 50 28, (017) 395 75 67 — дзяжурная часць УСК па Мінску, або па нумары 102. Прыватнасць гарантуецца.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

## РЭЙСАВЫ АЎТОБУС У КЮВЕЦЕ

**У Полацкім раёне рэйсавы аўтобус з 12 пасажырамі з'ехаў у кювет і сутыкнуўся з дрэвам. 8 пасажыраў атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці, пацярпеў і вадзіцель.**

— Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося а сёмай гадзіне вечара каля вёскі Багушова. Аўтобус «Радзіміч», які належыць філіялу Аўтобуснага парка № 2 г. Полацка таварыства «Віцебскаблаўтатранс», рухаўся па маршруце Полацк-Мурашкі. Вадзіцель рэйсавага аўтобуса, 1955 года нараджэння, не справіўся з кіраваннем, у выніку чаго аўтобус з'ехаў у кювет і сутыкнуўся з дрэвам, — паведаміла Марына Фандо, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях.

Брыгадамі хуткай медыцынскай дапамогі пацярпелыя пасажыры і вадзіцель з траўмамі рознай ступені цяжкасці былі дастаўлены ў Полацкую бальніцу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ТРАКТАР ПЫХНУЎ У ПОЛІ

**Удзень стала вядома пра здарэнне ў полі каля вёскі Пятрылава Капыльскага раёна.**

Калі супрацоўнікі раённага падраздзялення МНС прыбылі на месца, тэхніка 2007 года выпуску ўжо гарэла. Механізатар самастойна спрабаваў суцішыць агонь, але марна. Работнікі МНС выратавалі ад таго ж лёсу камбінаваны пасяўны агрэгат. На момант здарэння трактар удзельнічаў у пасяўных работах. Ніхто не пацярпеў. Прычыны пажару высвятляюцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УКРАЎ 1 ТЫСЯЧУ ТОН АСФАЛЬТАБЕТОНУ

**У дачыненні да аднаго з кіраўнікоў рамонтна-вытворчага КУП «Гордаматэрыялы» і двух прадстаўнікоў будаўнічага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства г. Мінска заведзена крымінальная справа.**

Як паведамляюць у прэс-службе Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, намеснік дырэктара КУП «Гордаматэрыялы» 14-16 жніўня гэтага года у інтарэсах будаўнічай камерцыйнай структуры ўкраў з прадпрыемства асфальтабетонную сумесь, прызначаную для будаўніцтва МКАД агульным коштам звыш 600 млн рублёў. Каля 1 тысячы тон асфальтабетоннай сумесі камерсанты планавалі рэалізаваць дзяржаўнай дарожна-будаўнічай арганізацыі. У якасці ўзнагароджання прадпрымальны чыноўнік атрымаў ад кіраўнікоў камерцыйнай структуры 20 тысяч долараў. Падазроныя затрыманы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## БЫВАЙ, ЛЮБІМАЯ ЛОДКА...

**Штраф і канфіскацыя лодкі — такія рашэнні вынеслі суды Мінскага і Чашніцкага раёнаў у дачыненні да браканьераў, затрыманых на Заслаўскім вадасховішчы і возеры Лукомльскім.**

— Два жыхары вёскі Ганалес рыбачылі на Мінскім моры пры дапамозе забароненых сеткавых прылад лоўлі. І хаця на момант затрымання паспелі выставіць толькі адну сетку, гэтага аказалася дастатковым, каб суд прыцягнуў браканьераў да адказнасці за замах на незаконную лоўлю рыбы. Парушальнікам прызначаны штраф — па мільёне рублёў на кожнага, а маторная лодка «Аўтабот» канфіскавана ў даход дзяржавы, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Цікава, што гэта ж самае маламернае судна ўжо раней канфіскоўвалася ў сына аднаго з затрыманых: тады малады чалавек таксама парушыў правілы рыбалоўства. Праўда, пасля канфіскацыі сям'і дазволілі выкупіць лодку. Зараз з суднам давядзецца развітацца. Яго прыкладны кошт на рынку — больш за 2,5 мільёна рублёў.

А на возеры Лукомльскім супрацоўнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі затрымалі жыхара Навалукомля, які пры дапамозе маторнай лодкі і сетак таксама незаконна здабываў рыбу. Падчас праследавання парушальнік выкінуў мех з сеткамі і здабычай у ваду. Аднак дзяржінспектары вялі відэаздымкі, і менавіта запіс паслужыў доказам у судзе процiпраўных дзеянняў грамадзяніна. Штраф за незаконную здабычу рыбы і непадпарадкаванне службовай асобе склаў 3,4 мільёна рублёў. Таксама ў парушальніка канфіскавана алюмініевая лодка «Обь» з маторам «Хонда». Рынкавы кошт такога судна складае каля 45 мільёнаў рублёў.

## ХУЛІГАН ПАШКОДЗІЎ ВОСЕМ МАШЫН

**Ноччу ў Цэнтральны РУУС сталіцы паведамілі, што ў раёне вуліцы Арлоўскай невядомы малады чалавек... скача па машынах.**

На месцы міліцыянераў сустрэў мужчына, які распавёў, што а палове чацвёртай раніцы выйшаў на балкон і заўважыў, што малады чалавек, праходзячы каля прыпаркаваных аўтамашын, пачаў наносіць па іх удары нагой. А потым увогуле заскочыў на капот аднаго з легкавікоў. Сведка апісаў прыкметы хулігана і паказаў, куды той падаўся. Зламысніка неўзабаве затрымалі ў адным з суседніх двароў. Дэбаширам аказаўся 22-гадовы раней судзімы мінчанін, які перад здарэннем непадалёку распіваў са знаёмымі спіртныя напоі. Ахвярамі хулігана сталі восем аўтамашын.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «Сябры казалі: «Лера, знімі ружовыя акуляры!»

**Валерыя Кліцунова — лаўрэат конкурсу «Чалавек справы-2009» у намінацыі «За самую арыгінальную бізнес-ідэю, якую ўвасобіў айчынны прадпрымальнік».**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Загарэлася ідэяй** развіцця сельскага турызму пасля таго, як пагасцявала ў сядзібе ў Паланзе. Там я наяве ўбачыла, што такое — аграэкатурызм. Пазнаёміліся з гаспадаром. Ён распавёў, што ў Літве ёсць асацыяцыя сельскага турызму, якая дапамагае ўладальнікам сядзіб развіваць гэтую справу. Вярнулася дадому і патэлефанавала прэзідэнту літоўскай асацыяцыі Рэгіне Сірусене. Запрасіла яе ў «Дудуткі». Менавіта яна мне і падказала, куды рухацца, з чаго пачынаць.

**Сябры казалі:** «Лера, знімі ружовыя акуляры. Гэта немагчыма. Мы ж не Польшча, ні Літва...» Тым не менш, я здолела аб'яднаць аднадумцаў, людзей, якія жадаюць займацца сельскім турызмам. І ў 2002 годзе з'явілася першае беларускае рэгіянальнае грамадскае аб'яднанне «Агра- і экатурызм». Ужо праз год яно вырасла ў нацыянальнае аб'яднанне «Адпачынак у вёсцы». Вяскоўцы зразумелі, што не толькі карова можа іх карміць, але і сама прырода, побыт і культура.

**У Беларусі зарэгістравана** больш за 2 тысячы аграсядзіб. З іх амаль палавіна актыўна займаецца прыёмам турыстаў. Гэта значнае дасягненне, калі ўлічыць, што 10 гадоў таму ў нас слова «аграэкатурызм» наогул не ўжывалася.

**Сімвалам беларускага аграэкатурызму** вырашылі зрабіць зялёнага пеўня, бо ён асацыюецца з вёскай, з нечым светлым, ён будзіць людзей і разганяе злых духаў. Вядомы мастак па вышыванцы Слава Дубінка выразаў нам эмблему ў выглядзе дарослага пеўніка з дзеткамі невыпадкова. Бо сельскі турызм у Беларусі — на 99% сямейны бізнес. Як правіла, гэта тандэм «муж—жонка». Мне вельмі падабаецца, што многія дзеці пачалі ўцягвацца ў гэты працэс. Вучацца турызму і вяртаюцца ў вёску.

**На пенсіі** я таксама планую заняцца аграэкатурызмам. Некалі мясцовыя жыхары ўгаварылі мяне набыць дом у Расонскім раёне. Ён стаіць у цудоўным месцы, на беразе возера, побач рака. Поўная прыродная ізаляцыя, адным словам. Дом той калісьці належаў фатографу. Хачу даць яму другое дыханне. Раблю там стылізацыю 60-х гадоў мінулага стагоддзя: блакітныя капы, прошвы...

### ПРА ЦЭМЕНТАВЫЯ ПЛАТЫ, ТУІ І ДРЭСІРАВАНЫХ КАРОЎ

**Раней я не бачыла** ніякага хараства ў нашых драўляных хатах. Кардынальна змяніла меркаванне пра беларускую вёску толькі тады, калі паглядзела на яе вачыма замежнікаў. Вёскі, дзе захавалася традыцыйная беларуская забудова, выклікаюць у іх захапленне. Зараз







я таксама лічу, што вёска — наш здабытак. Хаты з разнымі ліштвамі, платы. Толькі не цэментавыя! Тое, што цяпер адбываецца замена драўляных платоў на цэментавыя, — гэта жахліва. Нікому не раю іх ставіць. Гэта проста знішчэнне беларускай вёскі.

**Сэрца крывёю абліваецца,** калі бачу сярод драўляных дамоў белы трохпавярховы асабняк з сілікатнай цэглы. У англійскай вёсцы гэта немагчыма. Вам проста не дазволяць парушыць архітэктурную гармонію. Хочацца, каб і ў нас з'явіўся строгі закон аб захаванні сельскага ландшафту.

**Вёска павінна быць** падобнай на вёску. Я за тое, каб застаўся агарод, магчыма, меншага памеру. І абавязкова кветнікі! Прычым я супраць туй, якімі цяпер паўсюдна абсаджваюць сядзібы. Бо беларуская вёска мае свае традыцыйныя кветкі.

**Пасялілі мы неяк у вясковую хату** экспертаў з Англіі і Амерыкі. Праз тыдзень спыталі ў іх: «Што вас больш за ўсё здзівіла?» Яны адказалі: «Дзве гаспадарскія каровы. Яны самі кудысьці сыходзілі і вярталіся...» Зразумела, што каровы сыходзілі на пашу. Але для іх гэта былі «дрэсіраваныя каровы», таму што «самі сыходзілі». Для заходняга чалавека гэта фантастыка! Многія з іх упершыню каштуюць свойскае яйка, бачаць, як дояць карову, як цэдзяць малако, б'юць з яго масла пры дапамозе драўлянай маслабойкі... Захапляюцца замежныя турысты і тым, што мы здолелі захаваць традыцыйныя абрады, рамёствы!

**У мяне вельмі сентыментальнае стаўленне** да нашай беларускай керамікі. Яна вельмі вытанчаная, элегантная. Маю шмат вырабаў з гліны, прычым не толькі на працы, але і дома. Некаторыя работы вельмі вядомых майстроў. Мне падабаецца, што раней ганчары ўсё прадумвалі да дробязяў. Вось гэтаму гарлачу гадоў 60 (*паказвае*), дык ён зроблены так, каб нават бабка, у якой трасуцца рукі, магла яго ўтрымліваць. У мяне дома ёсць гліняны сервіз, пакрыты зялёнай глазурай. Ён зроблены ў «Дудутках». І я ім вельмі даражу. Калі сервірую ім стол на прыродзе, госці не ўтойваюць захаплення...

**Мы можам стаць** славянскай Швейцарыяй ці Італіяй. Краінай сельскага турызму для ўсёй Еўропы. У нас для гэтага ўсё ёсць. Некранутая прырода, шматлікія абрады і традыцыі, добрыя дарогі, вельмі гасцінныя і душэўныя людзі. Як пісаў Караткевіч, «Беларусь — гэта край раскрытых душ і дзвярэй». Трэба толькі вырашыць дыпламатычныя пытанні з візамі і праблемы з інфраструктурай. Бо турысты гатовы пакідаць у вёсцы грошы: набываць сувеніры, арандаваць аўтамабілі, лодкі, веласіпеды, наведваць музеі... Але не паўсюль пакуль створаны ўмовы.

**У Беларусі няма** ніводнай аграсядзібы, дзе б маглі адпачываць інваліды-калясачнікі. Гэта проста абсурдна. І справа, як высветлілася, не ў тым, што гаспадары сядзіб не хочуць гэтым займацца. Яны проста не ведалі, што такая праблема ёсць. Таму зараз мы гэтай тэмай заняліся ўшчыльную. Праводзім адаптацыю сядзіб, распрацоўваем экскурсіі для інвалідаў-калясачнікаў па Налібоцкай пушчы. Людзі з абмежаваннямі маюць такія ж правы на адпачынак, як і мы з вамі. Тым больш, не варта забываць, што бяда можа здарыцца з кожным.

### ПРА КЛАСТАРЫ, ЦМОКА І БЕЛАРУСКІ КУРОРТ

**Ёсць у нас** крэатыўныя сядзібы. Напрыклад, гаспадыня сядзібы «Дамелька» ў Смалявіцкім раёне захапляецца фітадызайнам і праводзіць майстар-класы па працы з кветкамі. Васіль Фралоў з жонкай Алай зрабілі ў Валожынскім раёне сядзібу, прысвечаную пчалярству. Там нават ёсць шкляны вулей, каб назіраць за тым, як жывуць пчолы. На сядзібе «Барок» музыкі Алеся Лася ёсць музей старадаўніх прылад. Гаспадар сам аднаўляе прылады, робіць дуды, вучыць беларусаў традыцыйным танцам...

**Каб стварыць** арыгінальны рэгіянальны турпрадукт, мясцовым уладам і гаспадарам сядзіб трэба навучыцца працаваць разам. Бо будучыня ў аграэкатурызме і ў цэлым у эканоміцы менавіта за кластарамі.

**Ярчэй за ўсіх** у гэтым плане развіваецца Валожынскі раён. Там каля 30 сядзіб аб'яднана вакол зялёнага маршруту «Валожынскія гасцінцы» ў агратурыстычны кластар. Туды ўваходзяць і мясцовыя музеі, і фермеры, у якіх ёсць стайні, і мастакі, якія аздабляюць сядзібы, і фабрыка «Іўкон», якая ладзіць «Цукеркавы фэст». На тэрыторыі раёна ёсць санаторый, куды гаспадары сядзіб возяць сваіх турыстаў на масаж, у басейн. Там жывуць вельмі творчыя людзі, і ў іх вельмі шмат крэатыўных ідэй. Так, ёсць думкі зрабіць фестываль, звязаны з развіццём ніжняй бялізны. Бо, аказваецца, вынаходніца станіка Іда Розенталь родам з тых мясцін...

**Кожны рэгіён павінен мець** цікавую адметнасць. Бо людзі не паедуць у вёску дзеля ложка і ежы. Зацікавіць сучасных турыстаў можна нейкай унікальнай цікавінкай. Напрыклад, у Дрыбінскім раёне распаўсюджана шапавальства. Там ёсць грамадскае аб'яднанне шапавалаў, цудоўны музей, звязаны з традыцыяй ручнога вырабу валёнак, свята «Дрыбінскія таржкі»... У шапавальстве я бачу для рэгіёна вялікую перспектыву. Ім засталося толькі скааперавацца і больш інтэнсіўна працаваць на гэтую ідэю ўсім раёнам.

**У Лепельскім раёне** пачынаюць развіваць вобраз цмока, які, па Караткевічу, жыў у Лепельскім возеры. Ужо ў верасні на дзень горада там з'явіцца помнік гэтай істоце. Мы ж нічым не горшыя за Шатландыю, якая прываблівае турыстаў легендай пра Лох-Нескую пачвару.

**Першы аграэкатурыстычны курорт** у Беларусі плануем зрабіць у Расонскім раёне. Бо гэта самы чысты раён. Там 80 адсоткаў лесу, каля 200 рэк і азёр, ёсць мінеральныя воды, сапрапель, заказнікі «Сіньша» і «Чырвоны Бор», вельмі шмат аграсядзіб. Мясцовы тураператар мог бы штодзень арганізоўваць нейкія праграмы для тых, хто адпачывае.

**Яшчэ адзін цікавы шлях** развіцця сельскай тэрыторыі назіраю ў Карэліцкім раёне. Бацька набыў закінутую вёску для сваёй дачкі — маёй выпускніцы (Валерыя Кліцунова, да таго ж, з'яўляецца дацэнтам кафедры міжнароднага турызму БДУ). Вёска ўключае 17 хат, якія цяпер аднаўляюцца з захаваннем аўтэнтычных традыцый. Там плануецца стварыць турыстычны комплекс.

### ПРА ШКЛЯНУЮ ТЭРАСУ, СЭРЦАБІЦЦЁ І ДЫСКРЫМІНАЦЫЮ

**Я практычна не адпачываю.** Магу, вядома, паехаць на тыдзень туды, дзе мора і сонца. Але вострай патрэбы ў адпачынку не адчуваю. Бо па працы я вельмі шмат перамяшчаюся, таму атрымліваецца, што рух, новыя ўражанні — гэта мой лад жыцця. Нават калі еду праводзіць семінар у вёску, адпачываю душой і целам. Душой — бо займаюся любімай справай, целам — бо пасля семінара ўсіх яго ўдзельнікаў чакае купанне, лазня, забавы...

**Больш за ўсё люблю** бавіць час у сваім доме ў Дудутках. Вакол — сад. Ёсць там вялізная шкляная тэраса, над якой звісаюць галінкі дрэў. Таму нават у дождж і холад на тэрасе камфортна, адчуванне, што знаходзішся на прыродзе. Збіраюся асесці там на некалькі месяцаў і завяршыць некалькі кніг.

**Маё сэрца б'ецца часцей,** калі займаюся развіццём аграэкатурызму ці гавару на гэтую тэму. Аднойчы да нас у офіс прыходзіў прадстаўнік «Зялёнай партыі». Распавядаў пра свой праект. «Малайцы, — кажу, — добрая ідэя». «Ну, значыць, вы будзеце з намі яе прасоўваць». «Не, — кажу. — Маё сэрца не стала біцца часцей». Ён, магчыма, падумаў, што я вар'ятка. Але я пераканана, што калі адразу сэрца не стала часцей біцца, значыць, не варта губляць час.

**Стогны пра дыскрымінацыю** жанчын некалькі надуманыя. Я абсалютна ў іх не веру. І ні ў адну жаночую арганізацыю не ўступала і не ўступлю. Таму што, лічу, гендарнай праблемы няма. Праблема не паміж паламі — яна ў самой жанчыне. Кожны мае тое, што жадае. Гэта я кажу, вядома, пра свой досвед. Калі я выйшла замуж у 17 гадоў, у мяне быў досыць цвёрды кантроль над маімі жаданнямі, бо Яўген Будзінас быў нашмат старэйшы за мяне: маўляў, гэта табе нельга чытаць, гэта табе не трэба рабіць... Словам, «месца ўсходняй жанчыны на кухні». Я дамаглася ўсяго праз супраціў, ніхто нічога не паднёс мне на спадачку, я ваявала за свае правы.

**У нас дзіўнае грамадства.** З аднаго боку, у нас ніколі не абяруць жанчыну прэзідэнтам ці прэм'ер-міністрам, як, напрыклад, у Турцыі ці ў Пакістане. Перш за ўсё таму, што ў саміх жанчын ёсць меркаванне: «Не жаночая гэта справа». З іншай — займацца бізнесам жанчынам у нас лягчэй. Мужчыны цвёрда канкурыруюць адзін з адным, а да жанчыны гэтага пачуцця яны не адчуваюць. Я магу дазволіць сабе нефармальныя паводзіны, мяккасць, жарт, гумар — нават у гутарцы з чыноўнікамі. Прызнацца, я не жадала б быць мужчынам.

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

■ На слыху

# ВОЖЫКАМ НЕ БАЛІЦЬ?

**У Кіеве знявечылі знакамітую скульптуру галоўнага героя мультфільма «Вожык у тумане» (аўтар Канстанцін Скрытуцкі даў ёй іранічную назву «Конік»), якую любяць не толькі мясцовыя жыхары, але і шматлікія турысты, у тым ліку і з нашай краіны. Колькі фотаздымкаў было зроблена «ў абдымках» з калючай, але такой мілай істотай!**



Вандалы выкралі вузельчык са слоікам варэння, які вожык беражліва трымаў у лапках. Звярок таксама страціў шмат іголак-цвічкоў, а яго пыску зараз «ўпрыгожвае» вялікая шчыліна. «Мабыць, пры рабаванні ён супраціўляўся...» — каментуюць у інтэрнэце навіну пра непаважлівае абыходжанне з вожыкам.

Дарэчы, гэта ўжо не першы выпадак, калі ў Кіеве ламаюць скульптуры. І чамусьці ўвагу вандалаў асабліва прыцягваюць фігуры аўтарства Канстанціна Скрытуцкага. У маі невядомыя паздзекаваліся з некалькіх паркавых скульптур на Пейзажнай алеі: зебра, якая ўпрыгожвае фантан, засталася без керамічнай нагі (вядома, навошта зебры керамічная нага?), а Лісу, сябру Маленькага прынца, адламалі вушы і ўвогуле адарвалі яго ад пастамента (напэўна, звер пацярпеў за сваё вядомае настаўленне быць адказнымі за тых, каго прыручылі, якое вандалы, мяркуючы па ўсім, не падзяляюць).

Хочацца задаць толькі адно пытанне: навошта? Навошта разбураць створаную чалавекам прыгажосць, у якую ён укладваў часцінку сваёй душы, спадзеючыся парадаваць іншых людзей? Што гэта: зайздрасць і злосць ад таго, што сам не здольны быць творцам, ці інстынктыўная, першабытная цяга людзей да разбурэння? А можа, слава Герастрата не дае спакою? У такім выпадку раім шкоднікам пакідаць на «месцы злачынства» кантактныя звесткі: каб народ ведаў імёны сваіх «герояў».

**Алена ЗАРЭЧНАЯ**

■ Выкажы сваё меркаванне

# А ЯК ВЫ СТАВІЦЕСЯ ДА ЖАНЧЫН — КІРОЎЦАЎ АЎТОБУСАЎ?

**Сёлета Міністэрствам транспарту і камунікацый запланаваны перагляд правілаў перавозкі пасажыраў аўтамабільным транспартам, што былі зацверджаны пастановай Саўміна ў 2008 годзе. З улікам прапаноў, што паступаюць у міністэрства, будуць удакладняцца палажэнні главы 11 «Аўтамабільныя перавозкі груп дзяцей аўтобусамі», у тым ліку патрабаванні да кіроўцаў, што перавозяць групы дзяцей.**

Як нагадалі ў прэс-цэнтры Мінтранса, зараз да аўтамабільнай перавозкі дзяцей допускаюцца кіроўцы, якія маюць не менш за тры гады беспералыннага стажу працы на механічных транспартных сродках катэгорыі «Д» і якія не прыцягваліся на працягу апошніх двух гадоў да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў дарожнага руху (катэгорыя «Д» — аўтамабілі, прызначаныя для перавозкі пасажыраў, якія маюць больш за восем месцаў для сядзення, акрамя сядзення кіроўцы).

У адрас міністэрства перыядычна паступаюць звароты з просьбамі, як зрабіць больш жорсткімі дзейныя патрабаванні, так і змякчыць іх. Акрамя таго, у арганізацыях аўтамабільнага транспарту сістэмы Мінтранса практычна ўсе кіроўцы механічных транспартных сродкаў катэгорыі «Д» — мужчыны, за выключэннем адзінкавых выпадкаў, калі кіроўцам аўтобуса працуе жанчына.

У сувязі з вышэйсказаным, Міністэрства транспарту і камунікацый просіць выказаць свае заўвагі, меркаванні і прапановы па ўзмацненні ці змякчэнні патрабаванняў да кіроўцаў, якія перавозяць групы дзяцей. У рамках гэтай тэмы прапануецца абмеркаваць пытанне аб прычынах нізкай папулярнасці прафесіі кіроўцы сярод жанчын і даверу грамадзян да жанчын-кіроўцаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# ВЯЧЭРА НЕ «ПА-НАШАМУ»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

...Першым пунктам, куды мы завіталі, стала папулярнае ў Мінску месца пад назвай «Лідо». Бістро вядомае сваёй смачнай кухняй і досыць дэмакратычнымі цэнамі, таму наведвальнікаў тут заўжды шмат. Вечарам, пасля працоўнага дня, гэта было асабліва заўважна.



Трэба сказаць, што згаданае бістро працуе па прынцыпе самаабслугоўвання, калі ўжо гатовыя стравы кожны наведвальнік самастойна ставіць на свой паднос, а пасля разлічваецца за іх на касе. Таму афіцыянтаў, што прымаюць замову, тут няма, затое ёсць персанал, які стаіць за прылаўкамі і па просьбе накладвае ў талерку тую ці іншую страву. Спачатку Дзіна звярнулася да трох жанчын, якія звычайна ў гэтым бістро займаюцца прыбіраннем сталоў.

Паразмаўляла з імі хвіліну другую і сышла з пустым падносам. Далей Дзіна пайшла да прылаўка з мяснымі стравамі. Назіраючы збоку, я зразумела, што тут таксама нешта не так. Праз нейкі час я выдыхнула з палёгкай: наша «турыстка» ішла да касы з талеркай на падносе. Няўжо, «перамога»?

***Уражанні Дзіны:***

*— Шчыра сказаць, я непрыемна здзіўлена! Бедныя іншаземцы! У іх ёсць рэальная рызыка застацца галоднымі. Жанчыны, да якіх я звярнулася ў самым пачатку, нямецкай мовы не разумелі. Дзве з іх адразу проста адвярнуліся ў іншы бок, робячы выгляд, што мяне не існуе. Толькі адна намагалася нешта мне сказаць, пры гэтым са смехам пытаючыся ў сяброўкі, што была побач: «А ты гаворыш па-нямецку?» Заўважыла іх упэўненасць вось у чым: жанчыны лічылі, нібыта я не разумею тое, што яны паміж сабой абмяркоўваюць, нават крыху пасміхаліся з мяне. У выніку, я адчула: нічым дапамагчы не могуць.*

*Вырашыла «паспытаць шчасця» ў іншым месцы. Можа, удасца хоць мясной ці рыбнай стравай падсілкавацца? «А гэта смачна?» — спытала я ў хлопца, што стаяў за прылаўкам. Каб не «памерці з голаду», папросту паказала пальцам на страву. Хлопец глядзеў на мяне колькі імгненняў, а пасля таксама ўключыў «тактыку слімака». «Схаваўся ў ракавіну», сказаў, што не разумее ні слова, перастаў звяртаць на мяне ўвагу, нават нейкім раздражнёным стаў. У нейкі момант стала вельмі непрыемна, але я па-ранейшаму ўсміхалася і намагалася патлумачыць, што ж хачу з'есці. Нуль рэакцыі! На гэта ўсё здзіўлена глядзела маладая пара. Муж і жонка пашкадавалі мяне і патлумачылі, што крыху гавораць па-англійску і могуць дапамагчы. Але сіл працягваць «быць у вобразе» неяк не стала. Таму адмовілася ад дапамогі і падзякавала ім, сказаўшы, што дрэнна ведаю англійскую мову. Толькі дзякуючы сваёй настойлівасці, паказаўшы некалькі разоў, што ж я хачу замовіць, нарэшце атрымала ў рукі жаданую талерку! Можна, вядома, спісаць усё на канец працоўнага дня і вялікую стомленасць, але ж гэта нейкае ненадзейнае апраўданне.*

*А між іншым, «Лідо» — гэта адно з самых маіх любімых месцаў у Мінску. Як беларуская дзяўчына, не маю да яго ніякіх прэтэнзій.*

*Паўдзельнічаць у гэтым эксперыменце мне было цікава не толькі таму, што я змагла папрактыкавацца ў замежнай мове. Невербальная камунікацыя — важная частка майго прафесійнага інтарэсу. Жэсты, эмоцыі, якія выражаюцца без слоў, таксама нясуць у сабе вельмі шмат інфармацыі. І, прызнаюся, у нейкія моманты мне давалі зразумець, што нікога не цікавяць мае праблемы.*

### «Фальш» ці «нацюрліх»?

Сетка рэстаранаў пад назвай «Васількі» прэзентуе сябе як месца, дзе можна пачаставацца «народнай» кухняй. У святочныя дні і выхадныя там часта не бывае свабодных месцаў.

Мы прыйшлі ў адзін з «васільковых» рэстаранаў. Як і дамаўляліся, селі за розныя столікі. Афіцыянтка, якая прымала заказ у нашай «замежнай госці», відавочна, нічога не разумела, але ўсміхалася. А гэта — палова справы. Колькі хвілін прысвяцілі разгляданню меню. Замова прынята! Няўжо ўсё так проста?

***Уражанні Дзіны:***

*— Дзяўчына па-нямецку таксама не гаварыла. Яна адразу пацікавілася, ці разумеем мы па-англійску. Я адказала, што трошкі ведаю гэтую мову. Тут мне неадкладна прынеслі меню на англійскай і папрасілі паказаць, што ж я жадаю замовіць. Я запыталася пра піцу, але ў меню яе не было. Афіцыянтка ветліва патлумачыла гэтую сітуацыю, сказаўшы, што ў адным з імі будынку працуе піцэрыя, таму гатаваць такую страву ім няма сэнсу. Яна гаварыла гэта не па-руску, а старалася падабраць вядомыя ёй англійскія словы, каб даць мне зразумець сітуацыю. Тады вырашана было зрабіць іншы выбар.*

*— Дрынкс? — я старалася адпавядаць ролі чалавека, які недасканала ведае англійскую мову.*

*Дзяўчына адразу ж адгарнула перада мной патрэбныя старонкі меню, прапаноўваючы ўсе магчымыя кактэлі, гарбату, каву.*

*З дапамогай пары простых англійскіх слоў я замовіла сабе малочны кактэйль і капучына. Пры гэтым я папрасіла, каб каву прынеслі не адразу, а крыху пазней. Маю просьбу задаволілі. Адносіны персаналу мне спадабаліся. Афіцыянтка не гаварыла добра на замежнай мове, але яна рабіла ўсё, каб я не адчувала ніякіх нязручнасцяў, і гэта было прыемна. Калі прынеслі каву, у галаву прыйшла думка зрабіць апошні невялічкі «тэст». Як вядома, інтэр'ер «Васількоў» афармлены ў этнастылі. Там шмат дрэва, натуральных тканін і «кветкавых» арнаментаў. Я вырашыла пацікавіцца, ці натуральным дрэвам аздоблены сцены. Тыя ж немцы, напрыклад, вельмі цэняць усё натуральнае. Гэта ўжо было занадта цяжка, але дзяўчына не разгубілася і паклікала сяброўку.*

*Нарэшце мы паразумеліся, і мне патлумачылі, што гэта толькі дэкарацыя. З вельмі прыемнымі эмоцыямі я папрасіла прынесці квіток і падзякавала афіцыянтцы за працу.*

### Ваш аўтограф, калі ласка!

«Эль Памідора» — таксама досыць вядомае сталічнае месца, дзе можна адносна нядорага пад'есці. Да століка Дзіны падышла дзяўчына-афіцыянтка і тут жа накіравалася назад. Замест яе прыйшла іншая. Яны пачалі размову і досыць доўга разглядвалі меню. Праз нейкі час Дзіне прынеслі выбраную ёй страву. Я справілася са сваёй хутчэй, а таму вырашыла пачакаць на вуліцы. Дзесяць, пятнаццаць хвілін чакання... Дзіны ўсё няма. Можа, нешта здарылася?

***Уражанні Дзіны:***

*— Першая афіцыянтка папрасіла прабачэння і сышла, бо ні нямецкай, ні англійскай мовамі не валодала. Паклікалі іншую дзяўчыну. Тая нядрэнна валодала англійскай, у яе было дасканалае вымаўленне. Я вырашыла, што буду ў гэтай сітуацыі чалавекам, якога «вядуць» па бязмежных прасторах меню. Паколькі, па легендзе, я англійскую разумею праз слова, то, замаўляючы піцу з сырам і вяндлінай, я зрабіла выгляд, што не ведаю, як на гэтай мове называецца апошняя. Што такое «шынкен» афіцыянтка не ведала, але яна намагалася... угадаць. Паказала на здымак у меню і акуратна спыталася: «Фіш?» Угадаць, на жаль, не змагла. Але я заўважыла, як яна стараецца знайсці са мной агульную мову, просіць прабачэння, што не разумее мяне, таму вырашыла аблегчыць ёй задачу і патлумачыла, што лепш замоўлю дэсерт.*

*Пасля ўвогуле было нешта неймавернае: я па-нямецку, а яна — па-англійску, абмяркоўвалі, які ж торт лепш замовіць, нават змаглі вызначыць, наколькі ён салодкі, які ў яго смак. І пры гэтым я не адчула ніякага раздражнення з боку афіцыянткі, хоць, відавочна, яе чакалі іншыя кліенты, а хвіліны трацілiся на мяне.*

*Калі прыйшоў час разлічвацца, я падзякавала ёй за працу і сказала, што торт быў вельмі смачным. Відаць было, што дзяўчына ўражана гэтымі словамі. Яна ўсміхнулася і прапанавала мне напісаць што-небудзь у кнізе гасцей. Прыйшлося затрымацца, каб напісаць падзяку.*

*Калі эксперымент падышоў да завяршэння, я адчула вялікую розніцу з тымі ўражаннямі, якія заставаліся ў мяне падчас наведвання ўсіх гэтых месцаў не ў якасці іншаземнай госці. Прычым, розніца гэтая з перагібамі ў процілеглыя бакі. Першы з якіх — «табе патрэбна, выкручвайся як хочаш», а другая — неверагодная порцыя ўвагі, якой я ніколі не адчувала, наведваючы кавярні як беларуска. Усе вышэйзгаданыя кавярні адкрыліся мне зусім з іншага ракурсу.*



***P.S. Узнікае пытанне, на якім узроўні Дзіна валодае замежнай мовай? Адкажу так: практыка паказала, што яе можна спакойна прадстаўляць знаёмым у якасці госці з іншай краіны, не баючыся пры гэтым быць «рассакрэчаным». Пацверджанне таму — афіцыянтка ў адной з кавярняў, што мы наведалі. Пасля таго, як Дзіна разлічылася і выйшла на вуліцу, гэтая дзяўчына з захапленнем стала шаптацца з сяброўкамі: «Божа мой, я ж па-нямецку зусім не разумею. Нават і не ведала, што рабіць! Але ж, здаецца, усё добра прайшло...». Я мела цудоўную магчымасць назіраць гэтую «сцэнку» на свае вочы. Чаму ўдзельніца эксперыменту карысталася нямецкай мовай, а не англійскай, з якой, усё ж, болей шанцаў быць зразуметым?***

***Прызнаюся, што мы не ставілі перад сабой мэты праэкзаменаваць афіцыянтаў і персанал кавярняў на прадмет бездакорнага ведання замежных моў. Галоўным тут было выявіць, наколькі людзі гатовы дапамагчы, праявіць увагу і, нягледзячы на моўны бар'ер, усё ж дагадзіць кліенту. А нямецкая мова якраз і зрабіла гэтую задачу больш складанай. І галоўнае пытанне: па якіх крытэрыях былі выбраны менавіта тры кавярні, згаданыя ў тэксце? Усё вельмі проста: папулярнасць і сярэдні ўзровень цэн. Памылкай было б думаць, што іншаземныя турысты, якія наведаюць Мінск, будуць харчавацца выключна ў дарагіх рэстаранах класа «люкс». Астатнія акалічнасці і супадзенні — выпадковасць. Чытачоў просім не лічыць вынікі эксперыменту нейкай «абсалютнай ісцінай». Гэта проста асобна ўзятыя сітуацыі, якія здарыліся з пэўным чалавекам, у нашым выпадку — з Дзінай. Іншая справа, што на месцы гэтага чалавека мог быць хтосьці іншы. Напрыклад — сапраўдны замежны госць.***

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

**На здымках: Дзяўчыну, якая згадзілася адзін вечар пабыць замежнай турысткай, завуць Дзіна.** *(Просім прабачэння ў чытачоў за няякаснае фота: карыстацца прафесійнай тэхнікай у абставінах «сакрэтнасці» не было ніякай магчымасці.)*

■ Пункт гледжання

# ГЕОРГІЙ ЛУКІЧ СКАРЫНА (ДОКТАР ФРАНЦЫСК) І ЯГО КАЛЯНДАР

**Калі святкаваць 500-годдзе пачатку Скарынам беларускага кнігадрукавання? У верасні 2016 года. Справа — у календары, якім карыстаўся Скарына...**

«Вси рεчи часъ имають...Час молчаниε и час молвεниε»
εклεсиастεсъ. — Прага: Докторъ Францискъ, 1518. — Л. s̃



Такім Скарына выглядае на сваім партрэце, упершыню выдадзеным у жанры фражскага ліста, перад пачаткам кнігавыдавецтва ў 1517 (1516) г. Уласна, з яго пачалася друкарская дзейнасць палачаніна. На плакетцы  (якая на клішэ мела выгляд з выразнымі крыжыкамі) ён зафіксаваў славянскай вяззю свае імёны «Гεωргя + Францяскъ + Скωрина + ». Парадокс не толькі ў тым, што «спецыялісты» глыбокадумна сцвярджаюць, нібыта Скарына́ іменем  (Гεωргя) сам сябе ніколі не называў, але і ў тым, што і не пісаў яго. Хто ж тады змясціў аўтограф імёнаў у публікацыі партрэта першы раз у жанры фражскага ліста і потым у пражскіх выданнях кніг Біблії?

Скарына́ карыстаўся жанрам фражскага ліста (пісьма), які ўзнік як спосаб перадачы навуковай інфармацыі графічнымі сродкамі для задавальнення патрэб непісьменных людзей у пазнанні. Твор уяўляе не толькі шэдэўр сінкрэтызму розных відаў творчасці, але і гармонію рэлігійна-філасофскай, навуковай, эстэтычнай свядомасці. Менавіта фражскі ліст «на асобным, не знітаваным з кнігай аркушы», быў знойдзены ў Публічнай бібліятэцы імя М.Я.Салтыкова-Шчадрына ў адной з «Книг ã Моисεявы Бытья». Партрэт, гравіраваны на дрэве, быў таксама апублікаваны ў кнізе «Ісус Сірахаў» (Прага, 5 снежня 1517 (1516), л. [82]), а таксама ў 4-й кнізе «Царстваў» (Прага, 10 жніўня 1518, л. см̃в (282)). У.В.Стасаў высока ацэньваў яго мастацкія вартасці, бо «равняется превосходняйшимъ нямецкимъ гравюрамъ того времени, по хорошему рисунку, силя и колоритности гравюры».

Персона адлюстравана як асоба эпохі Рэнесансу. Воблік натуры выяўляе прыбалтыйска-арыйскага homo sapiens. Гэта той светлы доўгагаловы (даліхацэфальны) тып, які існуе ў басейнах Заходняй Дзвіны і Нёмана, з тэндэнцыяй да масіўнасці, характэрнай для паўночных раёнаў (крывіч), з падабенствам да насельніцтва суседніх раёнаў Прыбалтыкі, тыповы прадстаўнік усходнееўрапейскага варыянта еўрапеоіднай расы.

## I. Скарына і яго ідэі

Гісторыю беларускага кнігадрукавання пачаў Скарына́ (Скары́ніч) (Скори́на; Scorina, Skaryna, Skorina, Skorznia, Skoryn[a]) Герогі, Францыск (-ус) (Францішак) (Franciscus, Francisc(o)) Лукіч (23 красавіка 1478, Полацк — кастрычнік-лістапад 1551, Падуя), доктар філасофіі і медыцыны, а магчыма, і тэалогіі. Яна мае некалькі юбілейных дат, якія ўсведамляюцца навуковай грамадскасцю, пачынаючы толькі з 400-годдзя, і чамусьці ў 1925 годзе, затым — 450-годдзе ў 1967-м, нарэшце, 480-годдзе ў 1997 і 490-годдзе ў 2007 г. Гэтую культуралагічную з'яву як нацыянальны феномен народ не мог адзначаць ні на 100-годдзе, ні на 200- і 300-годдзе з-за адмысловых стасункаў свайго існавання, абумоўленых сацыяльна-палітычнымі і рэлігійнымі прычынамі, якія спрыялі разарванасці прафесійнага інтэлектуальнага жыцця вярхоў грамадства з духоўным быццём усяго народа.

Спадчына Скарыны́ атрымала грамадскую ўвагу з боку навуковых колаў толькі ва ўмовах вяртання цікавасці да выдання Біблії на сучаснай рускай мове. Да гэтага яна існавала як «рэч у сабе», не маючы акадэмічнага тлумачэння як «рэчы для сябе» ў працах спецыялістаў. Калегіумы, якія былі спрэс па Беларусі, у тым ліку Полацкі калегіум (пасля — Полацкая іезуіцкая акадэмія), не цікавіліся феноменам.

Еднасць народа і беларускай культуры пасля Скарыны́ з канца XVI ст. і да канца XVIII ст. аказалася ў неспрыяльных умовах. Пастунова, а з 1697 г. і заканадаўча, з ужытку выцяснялася родная мова як дзяржаўная. Сабор уніятаў у Замосці (1720 г.) запатрабаваў казанні гаварыць не па-беларуску. Набіралі тэмп працэсы дэнацыяналізацыі і нацыянальнага ігнаравання вярхоў грамадства. Інтэлектуальная эліта губляла сацыяльную базу ў родным народзе, палемічная літаратура захлынулася ў езуіцкіх абдымках. Рэлігійнае і нацыянальнае раз'яднанне народа санкцыянавалася афіцыйнай палітыкай. У такіх умовах кнігі Скарыны, яго навукова-філасофскую спадчыну спасцігла незайздросная доля. Першадрукі Палачаніна набывалі прымяненне ў якасці пераплётаў канцылярскіх кніг ці вокладак іншых канфесійных выданняў.

Спачатку адсутнасць патрэбы ў святкаванні юбілеяў беларускага кнігадрукавання абумоўлівалася сацыяльным фактарам, бо ў афіцыёзнай атмасферы і пануючай канфесійнай ангажаванасці свядомасці ў грамадства на Беларусі ў пазначаны перыяд не ўзнікала патрэбы асэнсоўваць культуралагічныя з'явы беларускай гісторыі да таго часу, пакуль сюды не вярнулася ў якасці афіцыйнага пацвярджэння рэабілітацыя правамернасці спрадвечных духоўных каштоўнасцяў.

Палітыка Санкт-Пецярбурга пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай прынесла пад лозунгам «уз'яднання рускіх земляў» нечаканa парадаксальны плён: разам з палітыкай імперскасці (у сучасным значэнні слова — русіфікацыі), бо русаў нельга па вызначэнні русіфікаваць, тут пачынае рэабілітавацца праваслаўе як афіцыйна санкцыянаваная дзяржавай рэлігія і адпаведная ідэалогія. Спрадвечная вера продкаў аказалася не пад уціскам, і таму пад'ярэмны народ змог успомніць, што на абсягах сваёй краіны ад Полацкай Сафіі да гродзенскай Барыса-Глебскай царквы (Каложы), ад Вільні да Турава — старадаўніх сталіц — скрозь стаялі цэрквы, а на захадзе краіны яны былі па меншай меры за 2-3 стагоддзі да таго, як тут узняліся першыя касцёлы. Успомнілася, што пачатковай формай масавай хрысціянізацыі было праваслаўе, якое сваёй духоўнасцю ўплывала на сацыяльна-эканамічныя адносіны і выхоўвала асноўныя культурна-псіхалагічныя рысы беларусаў. А ў іх фарміраванні браў фундаментальны ўдзел Скарына́, паклаўшы непазбежнасць працэсам нацыяўтварэння, у іх традыцыях вёў асветніцкую работу. Яго светапогляд увасабляе нацыянальную ідэю як гармонію веры, ведаў і дзейнасці.

*Змог ён не толькі знаць*
*штукі з заломам,*
*Роднаму слову*
*ўмеў кніжны даць ход.*

Так пісаў пра гістарычнае значэнне яго справы народны паэт Янка Купала ў вершы «Над Нёманам», маючы на ўвазе знакавасць духоўнага подзвігу асветніка ў эвалюцыі грамадства ад язычніцтва да вышыняў хрысціянскай культуры:

*«... ведае свет,*
*што вялікіх дум цвет*
*Адно толькі*
*на зломе ўзрастае»*
**(Янка Купала.**
**«Песня званара»)**

Дзейнасць беларускага асветніка ўсталёўвала правобраз аб'яднанага грамадства ў кантэксце безальтэрнатыўнасці культуры і навукі. Сцвердзіўшы незваротнасць працэсу беларускага этнагенезу і адмаўляючы магчымасці этнічнага расколу, ён аб'ектыўна ператварыў для народа гісторыю беларускай ідэі з «рэчы-ў-сабе» ў «рэч-для-сябе», у аспект абсалютнай ідэі, паводле Гегеля, і спосабу яе самаразвіцця да стану ўвасаблення ў нацыянальнай дзяржаўнасці. З яго часу беларуская нацыянальная ідэя мае ў сваёй канкрэтыцы быцця перспектыву быць поўнасцю раскрытай як адзінства практычнай і тэарэтычнай ідэі, бо сваімі вызначэннямі «нацыянальная» і «(бела)руская» яна ўтварыла сваю «прыроду», у якой нараджаецца «нацыянальны дух».

## II. Вызначэнне ці прывязка дат да існуючага календара

Студэнту-гісторыку, які вывучае старадаўнія тэксты ў арыгінале, неабходна ўмець пераводзіць даты з аднаго стылю календара ў другі — напрыклад, з сакавіцкага ці вераснёвага гадоў паводле візантыйскай эры на студзеньскае навагоддзе новай эры. Пры сакавіцкім пачатку года, калі падзея датавана паміж сакавіком і снежнем (уключна), належыць адымаць 5508 гадоў, а калі дата падзеі прыпадае на студзень — люты, адымаецца на год менш — 5507 гадоў. Пры вераснёвым пачатку года, калі падзея мела месца паміж студзенем і жніўнем (уключна), адымаецца 5508. Нашы скарыназнаўцы гэтага не робяць.

Скарына не мог не прытрымлівацца прынятай на Русі сістэмы летазлічэння і календара ад верасня да жніўня — у прыватнасці, у спецыфічна каляндарным выданні, якім з'яўляецца яго «Паскалія» з «Малой падарожнай кніжкі» (МПК). Напрыклад, для 7031 г. ад стварэння свету паводле візантыйскай эры ці 1523 г. ад нараджэня Хрыстова ён падае парадак зацьменняў: *«Гибεль мεсεца всεго будεть ã дня марта пол θ̃ години по полудни. Другая гибяль всεя луны августа кε̃ по полунощ[и] 3 годи[ны]».* Або для 7038 г. і, адпаведна, 1530 г.: *«Гибεль всεго мεсεца будεть октоври? s̃ĩ дня шεстоε години по полуноци. Другая гибяль солнца, болшая половина, кĩ марта пол s̃ години пεрεд полуднε[м]».* У першым прыкладзе сакавік *папярэднічае* жніўню г.зн. Сёмы месяц — дванаццатамуу, а ў другім — кастрычнік папярэднічае сакавіку, ці другі месяц — сёмаму, бо пачатак бярэцца з першага месяца «кніжнага» года паводле вераснёвага стылю.

У тым жа парадку прыводзяцца рэлігійныя святы. Напрыклад, спачатку — *«Рожество Христово»,* а потым *«Благовещ[ение]».* Пры студзеньскім стылі яны ідуць наадварот, пачынаючы з Дабравешчання, а за ім прыпадае Нараджэнне Хрыстова. Дарэчы, з мноства свят «*непеременныхъ*», для вызначэння якіх не патрэбна пасхалія, разам з гэтымі двума ён пастаянна паказвае *«празникъ Георгея»,* а таксама *«м̃ мученик[ов]»* і *«Алеξсие».*

У вераснёвым гадавым цыкле пералічваюцца назвы месяцаў у МПК, пачынаючы з верасня: *«вресень, листопадъ, груде́нь, прасинець, стычень, люты, марецъ, кветень, май, чирвецъ, липець, серпень».*

Усведамленне гэтага факта дае магчымасць зрабіць радыкальны перагляд многіх існуючых палажэнняў, засведчыць неразуменне календара тагачаснай эпохі сучаснымі афіцыёзнымі адмыслоўцамі. Так, неабходна ведаць, што і канцылярыя Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, і «брація Русь», як, дарэчы і палова Еўропы з самой Сарбонай, прытрымліваліся вераснёвага стылю календара, карысталіся цыкламі індыктаў і індыктыёнаў, мяжа якіх прыходзілася на жнівень-верасень. У скрыназнаўстве ж пануе разуменне, нібыта ў тыя часы «прагрэсіўны» першадрукар карыстаўся студзеньскім стылем, што пярэчыць храналагічным даным, у тым ліку і прыведзеным прыкладам з МПК. Не ўсведамляецца, што чатыры месяцы *канца* года X паводле студзеньскага стылю (верасень — снежань) адпавядаюць чатыром месяцам *пачатку* года па формуле X + 1 паводле вераснёвага стылю. Таму публікацыі кніг, напрыклад, здзейсненыя ў жніўні, неправамерна ставяцца перад публікацыямі, датаванымі верасnем. Пачатак кнігадрукавання памылкова лічыцца з моманту выхаду «Псалтыра», а не «Кнігі святога Іава». Казус апісвае прымаўка аб калёсах, пастаўленых перад канём. Анталагічны факт ігнаруецца, як ігнаруецца першадрукарства Скарыны пад пяром прыхільнікаў «сапраўднай дыялектыкі». Калі Кіеў, «Мать городов русских», была выціснута на перыферыю як Паўднёва-Заходні край, інтэлектуальны апендыксацэнтрызм павёў і вядзе рэй у гісторыяграфіі, прыкладам чаго з'яўляецца выснова Л.С.Абэцэдарскага: ідэалагічна правільным будзе лічыць першадрукаром не полацкага Скарыну, а маскоўскага Івана Фёдарава. Дарэчы, ідэалагема ўзнікла ў адказ на публікацыю М. Р.Ларчанкі з аргументам аб тым, што Георгій Скарына́ пачаў друкаваць на беларускай мове на 47 гадоў раней за І.Фёдарава.

Аўтарытэтныя аўтары-гісторыкі ў выданні Энцыклапедыі Брытаніка ўсведамляюць гэты фальш, калі пішуць: «Першы пераклад Новага Запавету на рускую мову быў апублікаваны сумесна з царкоўнаславянскай версіяй ў 1821 г. Ён быў зроблены з грэчаскага арыгіналу. Але яшчэ раней некаторыя кнігі Біблії ўжо былі надрукаваны па-беларуску, *пачынаючы з кнігі Іава* (*выдзелена намі. — У.А.*), якая была перакладзена з Вульгаты і з царкоўнаславянскай версіі». Яны, безумоўна, маюць на ўвазе Скарынава выданне. Украінская гістарычная школа, як і англічане, не грашыла супраць каляндарных стыляў. Напрыклад, П.Папоў у 1924 г. пісаў, што Скарына выдаў перш за ўсё кнігі Біблії філасофскага зместу — І́ава, Саламонавы прыпавесці, Сіраха, гэта значыць зусім слушна першым вызначае выданне пачатку 1517 г. «Книги Светого Иωва» (10 верасня), а не «Псалтири» 6 жніўня — месяца, які быў апошнім у тым каляндарным годзе.

Так, вырашэнне праблемы датавання кніг *«Изъбранъного Мужа В лγкаръскыхъ наукахъ Докъторa Франъциска, Скоринина сына С полоцька *»* пачынаецца з дакладнага вызначэння першай вядомай публікацыі *«У старомъ Мεстε Празъскомъ Лγта По нарожεнию Г[о]с[по]да Іс[уса] Хр[и]ста Сына Божия, Изъ прячисты? Дεвици матεри божий Марии Тысεщъного Пятъсотого И сεдъмаго на дεсять М[ε]с[я]ца Сяпътяврия дъня Дεсятого «*, якой была «Книга Светого Иωва». Гэты 1517 год закончыўся выданнем «Псалтыра» 6 жніўня. Такім чынам, першая кніга вышла з друку 10.01.1517, што адпавядае студзеньскаму стылю як 10.09.1516, а апошняя ў тым годзе — 06.12.1517, што адпавядае студзеньскаму стылю як 06.08.1517. Пачаткам Скарынавага кнігадрукавання павінна лічыцца ў сучаснай сістэме летазлічэння і календара дата 10 верасня 1516 года, што адпавядае 10 верасня 1517 года па вераснёвым стылі, які зараз не ўжываецца ў грамадзянскай практыцы, але захоўваецца ў царкоўным календары.

Наша грамадства ў XXI стагоддзі, жывучы паводле студзеньскага стылю (сістэмы x), павінна адзначаць у верасні 2016 года 500-годдзе пачатку друкарскай дзейнасці Скарыны, гэта значыць, у месяцы, з якога пачынаўся б адлік новага года паводле вераснёвага стылю (сістэмы x - 1).

Беручы пад увагу агульнанацыянальнае значэнне сапраўднай даты пачатку беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання, звяртаем увагу на неабходнасць пэўных захадаў для ўкаранення яе ў грамадскай свядомасці. Не менш істотным будзе абвяржэнне «сенсацый» ад 12 лютага 2013 г. аб тым, што «паслядоўнікі практыкаваўшага ў Мінску расійскага астролага Паўла Глобы вылічылі, што Скарына быў менавіта Францыскам, а не Георгіем, як сцвярджалі некаторыя даследчыкі (Мікалай Садковіч, Яўгеній Львоў і інш.)». Але гэта варта асобнай размовы, каб прадэманстраваць штучнасць праблемы прафесяніма «доктар Францыск» і хроснага імя Скарыны — Георгій, заснаванай на жывучасці абэцэдаршчыны. Навуковападобны падман для аўтарытарнай свядомасці павінен пераадольвацца воляй да навуковага мыслення. Пытанне двух імёнаў Скарыны вырашаецца проста: уступаючы ў кніжную карпарацыю, яе член быў павінен прыняць новае імя, у абсягах карпарацыі толькі ім і карыстацца. Георгій Лукіч прыняў сабе імя заснавальніка ордэна мінарытаў Францыска. Мінарыт — значыць «просты, паспаліты»...

**Уладзімір АГІЕВІЧ,**
**кандыдат філасофскіх навук**

■

# ЧАСТКІ АДЗІНАГА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У канцы XX — пачатку XXI стагоддзя істотна змяніліся ўмовы сацыяльна-палітычнага жыцця практычна ўсіх славянскіх народаў, што непасрэдна адбілася на развіцці славянскіх моў, літаратур і культур, на змене стэрэатыпаў гэтага развіцця, унесла новыя тэмы і праблемы ў кола славістычных даследаванняў. Таму ў процівагу тэндэнцыі да інтэрнацыяналізацыі і нівеліравання нацыянальных адрозненняў у сучасным славянскім моўным і культурным развіцці сфарміравалася і пашырылася тэндэнцыя да нацыяналізацыі, накіраваная якраз на ўзмацненне нацыянальнай адметнасці і спецыфікі. Фарміраванне гэтай тэндэнцыі абумоўлена некалькімі прычынамі, галоўнымі сярод якіх з'яўляюцца: рэакцыя на неславянскую моўную і культурную экспансію; фарміраванне новых літаратурных славянскіх моў, літаратур і культур, для якіх важна замацаваць сваю адметнасць; новыя ўмовы функцыянавання і развіцця тых славянскіх моў, літаратур і культур, якія доўгі час існавалі ў цесным узаемадзеянні і канкурэнцыі з іншымі больш моцнымі ў камунікатыўных адносінах блізкароднаснымі славянскімі мовамі. Усё гэта ставіць перад сучаснай славістыкай новыя праблемы і задачы, патрабуе выпрацоўкі новых падыходаў і поглядаў...

**Старшыня балгарскага фонду «Славяне» прафесар Захарыя Захар'еў** гаварыў па-балгарску, бо рабочымі мовамі з'езда лічацца ўсе славянскія мовы. Перакладчыкі тут не прадугледжаны. І гэта сапраўды не перашкодзіла зразумець, што так усхвалявала балгарына:

— Славянская культура і цывілізацыя зрабілі вялізны ўклад у развіццё новай агульнаеўрапейскай і сусветнай культуры. Дасягненні, роля славян у еўрапейскай супольнасці і будзе прадметам нашай размовы. Міжнародны з'езд славістаў — гэта магчымасць яшчэ больш узмацніць сувязі паміж нашымі народамі. Іх духоўнае адзінства дасягаецца дзякуючы навуковаму дыялогу і агульначалавечым каштоўнасцям. А гэта немагчыма без сумесных высілкаў навукоўцаў і іншых спецыялістаў кожнай славянскай краіны паасобку.



**Член Міжнароднага камітэта славістаў, старшыня Расійскага камітэта славістаў Аляксандр Малдаван** адзначыў, што шматгадовая праца з'ездаў славістаў далёка пераўзыходзіць тыя спадзяванні, якія на іх ускладалі пачынальнікі, і дадаў:

— Мы зыходзім з таго, што гісторыя культур славянскіх народаў — гэта гісторыя іх шчыльнага ўзаемадзеяння. Нас яднае цікавасць да славістычных праблем розных народаў у іх шматбаковасці і перапляценні. Гэтым тэматыка з'езда прынцыпова адрозніваецца ад вывучэння асобных славянскіх моў і літаратур. Дарэчы будзе ўзгадаць і тое, што нават у часы ідэалагічнага дыктату міжнародны характар славянскага супрацоўніцтва дазваляў навукоўцам заставацца ў баку ад палітызацыі.



**Член Міжнароднага камітэта славістаў, старшыня Германскага нацыянальнага камітэта славістаў Герт Гентшаль** адзначыў, што сёлета ў Мінску трэба абмеркаваць некаторыя праблемы рэарганізацыі Міжнароднага з'езда славістаў, аднак закрануў і важную для ўсіх беларусаў тэму:

— Мая прысутнасць на з'ездзе, як і многіх іншых удзельнікаў, разам з цікавасцю да славістыкі, не ў апошнюю чаргу звязана і з цікавасцю да беларускай мовы і літаратуры. Няхай на гэтай мове будзе сказана шмат важнага, у першую чаргу, для саміх беларусаў. І няхай беларуская мова і літаратура будуць адным са шматлікіх прыкладаў культурнай разнастайнасці, якой вылучаецца наш стары еўрапейскі кантынент сярод іншых. Моўная разнастайнасць прыносіць карысць, у тым ліку эканамічную. Давайце разгледзім адзін невялікі прыклад — Швейцарыю. Гэты народ вельмі ветлівы, таму з намі, немцамі, размаўляе па-нямецку. Аднак паміж сабой яны ніколі гэтага рабіць не стануць. Справа ў тым, што швейцарцы, незалежна ад сацыяльнага статусу і адукацыі, адзін з адным заўсёды размаўляюць толькі на роднай мове, і немцы іх амаль не разумеюць. А раптам і Беларусь калі-небудзь ператворыцца ў славянскую Швейцарыю? Марыць не забараняецца, як кажуць у народзе. І мары часам спраўджваюцца, нават вельмі нечакана.

Герт Гентшаль сказаў некалькі сказаў на чыстай беларускай мове. І свае пажаданні ўдзельнікам Міжнароднага з'езда славістаў выказаў таксама на ёй. Гэта пэўным чынам адлюстравала сутнасць форуму: пашана да ўласных культуры і мовы, іх абарона, а таксама надзвычай уважлівае стаўленне да іншых народаў і клопат пра іх культурную адметнасць. Бо ўсе славяне, як вядома, браты.

**Ларыса ЦІМОШЫК, Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

■ У горадзе Бабруйску

# «ПАДАЙЦЕ СЫНУ ЛЕЙТЭНАНТА ШМІТА!»

**Шура Балаганаў трапіў нарэшце ў горад сваёй мары. Скульптура літаратурнага героя стала новай бабруйскай славутасцю.**

Сонечнай летняй раніцай каля скульптуры знакамітага літаратурнага героя мітусня. Тэлевізійнікі здымаюць сюжэт для праграмы «У горадзе Бабруйску...», а ў перапынках паміж дублямі два мужчыны, узброеныя марозівам і смартфонамі, спрабуюць зрабіць здымкі на памяць. На ўсё гэта з ветлівай цікавасцю пазіраюць бабруйскія жанчыны, якія ідуць з кайстрамі па сваіх гаспадарчых справах.

Скульптура слыннага літаратурнага героя з'явілася ў Бабруйску нядаўна — як падарунак гараджанам і іх гасцям на новы 2013 год ад дзяржаўнага прадпрыемства «Водаканал», але адразу стала папулярнай. Падобна на тое, што Шура Балаганаў і ў жалезе не страціў сваёй прыцягальнасці і абаяльнасці.

Малады чалавек стаіць каля ярка-ружовага акна рэстарана «Чырвоная вежа», у вольнай позе, трымаецца на сваю «вечную» кепку. У руках — талерка з сімвалічным залатым цялём, якое адсылае да знакамітага твора Ільфа і Пятрова. Калі прыглядзецца да фота — на талерцы ёсць цукерка. Гавораць, што пакласці грошыкі ці ласунак «для Шуры Балаганава» — цяпер добрая бабруйская прымета, на шчасце і ўдачу ў справах.

«Падайце сыну лейтэнанта Шміта!» — адразу ўзгадваюць прыхільнікі твора. Іншая цытата з «Залатога цяляці», дзе махляры дзялілі зоны ўплыву і марылі атрымаць у распрацоўку «цудоўны, высокакультурны Бабруйск», ёсць каля скульптуры. «Пры слове «Бабруйск» сход хваравіта застагнаў...» Памятаеце?

— Шура Балаганаў пры любых абставінах заставаўся аптымістам і верыў у людзей, — узгадвае Таццяна Ларына, шэф-рэдактар перадачы «У горадзе Бабруйску...» тэлерадыёкампаніі «Магілёў». — А яшчэ, як мне падаецца, ён быў спагадлівым чалавекам, нягледзячы на сваю махлярскую справу, і трошкі рамантыкам. Таму ён і падабаецца.

Скульптуру Балаганава зрабіў маскоўскі аўтар Яраслаў Барадзін, паводле замовы гарадскога «Водаканала». Дырэктар гэтага прадпрыемства Алег Цітоў рухае розныя праекты, якія, безумоўна, ідуць на карысць роднаму гораду.

— Мы рады папулярнасці скульптуры Шуры Балаганава, хаця, вядома, і не чакалі такога поспеху, — прызнаецца цяпер Цітоў.

Гэта не першая творчая справа «Водаканала». Дзясятак гадоў таму прадпрыемства перарабіла старую воданапорную вежу 1927 года ў шыкоўны рэстаран, дзе вітражныя вокны спалучаюцца са старой чырвонай цэглай, а з апошняга паверха можна ўбачыць панараму Бабруйска. На флюгеры, дарэчы, — бабёр, сімвал горада. Рэстаран «Чырвоная вежа» на перакрыжаванні вуліц Пушкіна і Пралетарскай упрыгожыў Бабруйск.

«Водаканал» таксама адрамантаваў стары цеплаход, і цяпер «Мара» катае па Бярэзіне гараджан і турыстаў. Аб'яўлена таксама, што прадпрыемства адкрые сёлета Музей вады. У старым будынку рамонтна-механічнай майстэрні «Водаканала» размесціцца экспазіцыя, дзе можна будзе даведацца ўсё пра пітную ваду і забеспячэнні ёй людзей, ад старажытнасці да нашых дзён. Мяркуецца, што экскурсіі будуць пазнавальнымі і цікавымі найперш для школьнікаў, бо іх мэтай стане выхаванне культуры спажывання каштоўнага прыроднага рэсурсу. Дырэктар Алег Цітоў удакладніў, што адкрыццё Музея вады плануецца ўзімку. Але пра іншыя ідэі і іх ажыццяўленне не стаў казаць, каб не сурочыць.



Бабруйск на перакрыжаванні дарог.

Між тым, у творчай інтэлігенцыі Бабруйска шмат цікавых задумак і планаў. Напрыклад, драматург і карэнны бабруйчанін Валерый Аляксееў прапануе ўсталяваць помнік Зефіру, сімвалу вядомай на ўсю Беларусь фірменнай прадукцыі мясцовага прадпрыемства «Чырвоны харчавік».

— Новая ідэя Валерыя Аляксеева і скульптара Алега Ткачова — упрыгожыць шэрыя бабруйскія сцены знакавымі для горада рэчамі, — расказала пасля інтэрв'ю з творчымі асобамі Бабруйска Таццяна Ларына. — Напрыклад, на былой Інваліднай вуліцы, якая цяпер носіць імя Маркса, жыў калісьці Эфраім Севела, які напісаў кнігу «Легенды Інваліднай вуліцы». Можна было б на адной са сцен на гэтай вуліцы стварыць барэльеф з радкамі з твора вядомага пісьменніка, сцэнарыста і рэжысёра, ураджэнца Бабруйска.

Альбо яшчэ адна цікавая ідэя: каля мясцовага ЗАГСа зрабіць «Два боты ў пары», каб маладыя маглі залезці ў сімвалічныя жалезныя боты і зрабіць вясёлыя фотасесіі. Гэта магло б стаць новай бабруйскай традыцыяй!

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота аўтара.**

*Бабруйск.*


Шура Балаганаў у «цудоўным высокакультурным Бабруйску».

■ Свая справа

# ЯК СТАЦЬ РАМЕСНІКАМ?

## Пачаць новую працу можна ўсяго за дзень-два

**Якіх толькі хобі не бывае ў людзей: хтосьці робіць упрыгажэнні, хтосьці — гаршкі лепіць, нехта вяжа ці вышывае, а хтосьці нават гламурныя валёнкі ці цацкі валяе! І для некаторых з часам захапленне становіцца нядрэннай, а то і асноўнай крыніцай даходаў. Бо хто ж адмовіцца займацца любімай справай і пры гэтым працаваць у зручны для сябе час? Але як гэта зрабіць правільна і чаго гэта будзе каштаваць? Аказваецца, пачаць сваю справу можна ўсяго за дзень-два.**



### Гарадоцкія майстры

Шмат вядомых майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва працуюць у Гарадоцкім раёне. Гэтая зямля здаўна багатая традыцыямі ў вышыванні, кераміцы, разьбе па дрэве. Гэты здымак знаёміць з маладой вязальшчыцай Наталляй Юшковай. Зроблены кручком шаль — узор прыгожага жаночага ўбору, якім здаўна славяцца гарадоцкія майстры. У гарадскім доме рамёстваў Наталля працуе майстрам ткацтва. На гэтым жа здымку бачны герб Гарадка, выраблены другім майстрам — керамістам Ірынай Шалаевай.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

Самае галоўнае, вядома, дакладна вырашыць, а ці трэба вам надаваць свайму хобі афіцыйны статус? Калі вы працуеце ў асноўным для сябе і для блізкіх, прадаяце ўсяго пару паштовак у месяц і пакуль не плануеце пашыраць маштабы сваіх продажаў, тады гэта рабіць неабавязкова. Але калі вы хочаце забяспечваць сябе менавіта з дапамогай свайго хобі, калі жадаеце ўдзельнічаць у розных выставах, хочаце аддаваць свае вырабы на рэалізацыю ў крамы падарункаў і да т.п., тады трэба зарэгістравацца ў якасці рамесніка.

Стаць рамеснікам можна ўсяго за дзень-два, пры гэтым, як нам растлумачылі ў сталічнай падатковай інспекцыі, працэдура рэгістрацыі аднолькава даступная для ўсіх. Людзям з інваліднасцю няма неабходнасці прадастаўляць якія-небудзь дадатковыя дакументы. Адзінае выключэнне: калі асоба з інваліднасцю не можа самастойна звярнуцца ў падатковы орган з заявай (напрыклад, з-за фізічных абмежаванняў), гэта можа зрабіць хтосьці замест яго па афоромленай даверанасці.

### Колькі каштуе стаць рамеснікам?

Пералік відаў рамесніцкай дзейнасці даволі шырокі: ад вырабу і рамонту рыбалоўных снасцей, куфараў і вёдраў да бісерапляцення, вышыўкі, разьбы і макрамэ. Пры гэтым нядаўна гэты спіс дапоўніўся зусім новымі відамі рукадзелля: цяпер у яго ўваходзяць дэкупаж (дэкарыраванне тканіны, посуду, мэблі з дапамогай скрупулёзна выразанай паперы), тэра (тэхніка калажаў з выкарыстаннем натуральных складнікаў — ад ракавінак і пяску да галінак, пладоў і г. д.), скрапбукінг (ручны выраб паштовак і альбомаў для фатаграфій), квілінг (паперакручэнне), выцінанка і многія іншыя.

**Пад рамесніцкай дзейнасцю маецца на ўвазе дзейнасць фізічных асоб па вырабе і рэалізацыі тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг з прымяненнем ручной працы і інструменту, якая ажыццяўляецца самастойна, без прыцягнення іншых фізічных асоб па працоўных грамадзянска-прававых дагаворах, не з'яўляецца прадпрымальніцкай і скіравана на задавальненне бытавых патрэб грамадзян.**

Невялікая парада: лепш загадзя, перад прыходам у падатковую інспекцыю, выбраць з пераліку віды дзейнасці, якімі вы хочаце займацца. Пры гэтым колькасць іх можа быць любой, ад яе не залежыць сума падатковага збору.

Дарэчы, перастаньце баяцца велізарных выплат. Рамеснікі зараз плацяць не падаходны падатак, а рамесны збор у памеры 1 базавай велічыні ў год (сёння гэта 100 тысяч рублёў).

Такім чынам, вам варта звярнуцца ў падатковую інспекцыю па месцы жыхарства і там напісаць заяву і аплаціць падатковы збор. У падатковай на квітанцыю ставяць штамп і прысвойваюць УНП, якія становяцца афіцыйным дазволам для заняткаў «платным» рукадзеллем. З гэтага моманту вы маеце права прадаваць свае вырабы.

Пры афармленні дакументаў важна не забыцца, што ў кожнага рамесніка павінна быць Кніга ўліку праверак, набыць якую можна ў кніжных і канцылярскіх крамах. Яе трэба прашыць, выключаючы вокладку — тытульную і апошнюю старонкі, пранумараваць і здаць у падатковы орган.

**Перастаньце баяцца велізарных выплат! Рамеснікі зараз плацяць не падаходны падатак, а рамесны збор у памеры 1 базавай велічыні ў год (сёння гэта 100 тысяч рублёў).**

### Дзе прадаваць свае вырабы?

***Варыянт першы — інтэрнэт.*** Гэты варыянт самы просты, які не патрабуе нават выхаду з дому. Указ № 225 ад 16 мая 2005 года «Аб некаторых пытаннях ажыццяўлення фізічнымі асобамі раеснай дзейнасці» не змяшчае нормаў, якія абмяжоўваюць месца самастойнай рэалізацыі выраблена рамеснікам прадукцыі, а значыць, майстар можа без прыцягнення іншых асоб прадаваць сваю прадукцыю праз інтэрнэт — у сацыяльных сетках і з дапамогай віртуальных «вітрын», паведамілі ў Міністэрстве па падатках і зборах. Пры гэтым спецыялісты ўдакладняюць: інтэрнэт-вітрына — гэта старонка ў сецівe, якая змяшчае апісанне тавараў і ўказанне месцаў, дзе іх можна набыць. У выпадку, калі на сайце будуць размешчаны тэлефон, цана ці іншая інфармацыя, якая дазваляе зрабіць заказ або купіць вырабы, інтэрнэт-вітрыны з'яўляюцца інтэрнэт-крамамі. Для продажу рамесных тавараў у інтэрнэт-краме неабходны дадатковыя працэдуры рэгістрацыі: інтэрнэт-крамы — у Гандлёвым рэестры Рэспублікі Беларусь, а рамесніка — як індывідуальнага прадпрымальніка.

***Варыянт другі — галерэі.*** Рамеснік мае права заключаць дагаворы камісіі на рэалізацыю сваіх вырабаў з юрыдычнымі асобамі, напрыклад, галерэямі, крамамі, кіёскамі — любымі гандлёвымі пляцоўкамі, акрамя інтэрнэт-крам.

***Варыянт трэці — знаёмыя і сябры.*** Яны могуць купляць у вас эксклюзіўныя шэдэўры «з першых рук». Калі вы робіце добрыя і якасныя рэчы, спрацуе «сарафаннае радыё» — і пакупнікоў шукаць не прыйдзецца.

**Святлана БУСЬКО**

■

**УЖО ПІСАЛІ**

### Рамеснікі ў дэкрэце зноў змогуць разлічваць на поўную дапамогу

5 жніўня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяну Шчоткіну. Акрамя іншага, кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову ўрада аб прадастаўленні права асобным катэгорыям занятых грамадзян (рамеснікам, індывідуальным прадпрымальнікам, адвакатам, прыватным натарыусам) на прыпыненне адпаведных відаў дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

У нашай краіне грамадзяне, якія працуюць па працоўным дагаворы, маюць права на перыяд догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў прыпыніць працоўную дзейнасць і аформіць сацыяльны водпуск з выплатай дапамогі ў поўным памеры. Для самазанятых грамадзян такога права на прыпыненне сваёй дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці дзеючым заканадаўствам не даецца. У сувязі з гэтым, каб атрымліваць дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у поўным памеры, яны вымушаны прайсці ўстаноўленую працэдуру спынення адпаведнага віду дзейнасці.

Прэзідэнт даручыў распрацаваць простую і зручную схему прыпынення дзейнасці гэтымі катэгорыямі грамадзян. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны падрыхтуе праект адпаведнага ўказа ў бліжэйшы час. Прыняцце ўказа дасць магчымасць забяспечыць роўны падыход пры прызначэнні дзяржаўных дапамог да ўсіх катэгорый занятых асоб.

**КАМЕНТАРЫІ**

**Сяргей ДРАЗДОЎСКІ, каардынатар праектаў Офіса па правах людзей з інваліднасцю:**

З асабістага вопыту магу сказаць, што для людзей з інваліднасцю заняткі раеснай дзейнасцю — гэта, хутчэй, вымушаная неабходнасць, а не кліч душы. Гэта — ледзь ці не апошні шанц для многіх паспрабаваць сябе рэалізаваць і нешта зарабіць. Асноўная праблема, над якой, мабыць, інваліднасць «не навісае», — гэта продаж вырабаў у Беларусі. Напрыклад, у Віцебску жыве дзяўчына (яна перасоўваецца на калясцы), якая робіць выдатныя інтэр'ерныя лялькі. Сабекошт іх вялікі, рынак збыту не вельмі развіты, таму пакуль такую работу ператвараць у адзіную крыніцу даходаў вельмі рызыкоўна. Аднак сёння занятак рамяством — самае даступнае працаўладкаванне ў выглядзе самазанятасці, пры гэтым — з самымі малымі камерцыйнымі рызыкамі. Менавіта таму, задумваючыся, чым зарабляць на жыццё, не варта адкідаць і гэты кірунак. У Беларусі ёсць арганізацыі і людзі, здольныя дапамагчы і падказаць. Варта толькі ўзяцца!

**Таццяна ЖАРНАСЕК, спецыяліст па сувязях з грамадскасцю беларускага грамадскага аб'яднання «Пазітыўны рух»:**

— Гэта раней існавала меркаванне, што рэч, зробленая сваімі рукамі, ніколі не акупіцца і прадаюць іх проста «для душы». На мой погляд, калі граматна прапіярыць сваю дзейнасць, то можна добра падзарабіць. Галоўнае, каб была канцэпцыя. Вельмі добра спрацоўваюць такія ідэі, як «Купі рукавіцы — выратуй дзіця» або «Набудзь пакет з экалагічнага матэрыялу — выратуй восем дрэў». Так можна рабіць нават розныя сацыяльныя праекты! Ручная праца таксама можа быць цікавая турыстам, якіх у нашых гарадах становіцца ўсё больш. І няма розніцы, хто менавіта вырабляе гэтыя рэчы — людзі з інваліднасцю або без яе. Можна наогул не афішаваць гэта, асабліва калі мы хочам дамагчыся таго, каб людзі з інваліднасцю паверылі ў сябе.

**Анастасія КУЗЬМІЧ, каардынатар міжнародных моладзевых праграм міжнароднага грамадскага аб'яднання «Адукацыя без межаў»:**

— Мая праца дае магчымасць бываць у іншых краінах. Таму ў мяне шмат удалых прыкладаў таго, як людзі з інваліднасцю маюць актыўную жыццёвую пазіцыю ды і ў цэлым з'яўляюцца даволі моцна ўцягнутымі ў жыццё сваіх гарадоў і вёсачак. Вось напрыклад, аднойчы ў Вроцлаве мне пашчасціла пабываць на вулічным кірмашы хэнд-мэйд, які рабілі якраз людзі з інваліднасцю. Такой прыгажосці я яшчэ не бачыла — адтуль прывезла свае самыя любімыя завушніцы! Там, адразу на месцы, была магчымасць і пазнаёміцца, і пагутарыць з аўтарамі гэтых шэдэўраў! Чаму б такія кірмашы не праводзіць і ў нашай краіне?

■ Пытальнік

## ХТО ТРАПІЦЬ НА ЎЛІК МАЮЧЫХ ПАТРЭБУ Ў ПАЛЯПШЭННІ ЖЫЛЛЁВЫХ УМОЎ У СТАЛІЦЫ

**Спецыялісты ўпраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама паведамілі рэдакцыі, што ўлік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, вядзецца па месцы іх жыхарства (рэгістрацыі) адпаведнымі раённымі адміністрацыямі Мінска, а таксама па месцы працы ў арганізацыях.**

Для пастаноўкі на ўлік па месцы жыхарства з 10 жніўня 2011 года патрабуецца 10-гадовы тэрмін рэгістрацыі па месцы жыхарства ў сталіцы. Для пастаноўкі на такі ўлік па месцы працы ў Мінску, у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства, наяўнасць для гэтага пастаяннай рэгістрацыі ў горадзе не патрабуецца, аднак абавязковай умовай пры гэтым з'яўляецца 10-гадовы тэрмін працы ў арганізацыях сталіцы, што пацвярджаецца адпаведнымі запісамі ў працоўнай кніжцы. Час навучання ў вышэйшай навучальнай установе ў тэрмін такой працы не ўваходзіць.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

■ Як нас дураць

## ПРАДУКТЫ АД ЧАСУ ПСУЮЦЦА

**У Віцебску, у параўнанні з мінулым годам, назіраецца рост парушэнняў у гандлі. У прыватнасці, удзельная вага парушэнняў санітарных нормаў і правілаў павялічылася з 54% да 70%, невыканання патрабаванняў да якасці тавараў, якія рэалізуюцца — з 65 да 74%, непрадастаўлення пакупнікам неабходнай і дакладнай інфармацыі аб таварах — з 21 да 27%, паведамілі ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці.**

Ва ўсіх правераных 5 гандлёвых аб'ектах горада былі ўстаноўлены парушэнні. Напрыклад, у краме, якая належыць віцебскай фірме, прадавалі 3 найменні харчовых тавараў са скончаным тэрмінам прыдатнасці. Да работы былі дапушчаны прадаўцы без праходжання перыядычнага медыцынскага агляду. У гандлёвай зале крамы выкладка харчовай прадукцыі ажыццяўлялася непасрэдна на дно халадзільнай вітрыны без спецыяльных гандлёвых латкоў, падносаў. У продажы адсутнічалі мяса і мясныя паўфабрыкаты, птушка, маргарынавая і кісламалочная прадукцыя...

А ў іншай краме ў аналагічнай вітрыне захоўваліся сырая харчовая прадукцыя побач з гатовай да ўжывання. Пакупнікам прапаноўвалі 6 найменняў харчовых тавараў са скончаным тэрмінам прыдатнасці. Больш за тое — на 5 найменняў кандытарскіх вырабаў да ведама пакупнікоў не была даведзена інфармацыя пра дату вырабу і тэрмін прыдатнасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

■ На слыху

## НАЧАЛЬНІКА ЎПРАЎЛЕННЯ МІНЮСТА І ЯЕ НАМЕСНІКА ЗАТРЫМАЛІ «НА ГАРАЧЫМ»

**За атрыманне хабару ў памеры 1000 долараў супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі затрымалі начальніка ўпраўлення Міністэрства юстыцыі Беларусі і яе намесніка. Непасрэдна пры перадачы грошай быў затрыманы і хабарадавальнік — заснавальнік адной з прыватных будаўнічых структур Мінска.**

У прэс-службе КДБ паведамілі, што чыноўнікі, як высветлілася, і раней неаднаразова атрымлівалі незаконныя грашовыя ўзнагароды за садзейнічанне ў спрыяльным рашэнні пытанняў, якія ўваходзілі ў іх кампетэнцыю.

Зараз службовыя асобы Мінюста і заснавальнік фірмы знаходзяцца ў следчым ізалятары КДБ. У дачыненні да іх заведзены крымінальныя справы.

**Надзея ПАЎЛАВА**

■

■ Святло ў акне

# ВЕРА ДЗЕЯННЕМ ЖЫВАЯ

## Усё больш сацыяльных аб'ектаў ствараецца пад эгідай рэлігійных арганізацый Брэстчыны

**Падчас паездкі групы журналістаў па сацыяльных аб'ектах, арганізаванай аддзелам па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Брэсцкага аблвыканкама, не раз даводзілася чуць у розных інтэрпрэтацыях, што вера без справы мёртвая. Гэта вядома з даўніх часоў. З глыбінь вякоў ідзе традыцыя дапамагаць таму, хто мае патрэбу ў спагадзе і міласэрнасці. Удзельнікам прэс-тура на свае вочы давялося ўбачыць установы, якія служаць дабру год-два, а то і дзясяткі гадоў.**

### Пераадолець абыякавасць

Кіраўнік аддзела сацыяльнага служэння Пінскай епархіі айцец Сергій Платніцкі расказаў пра цэнтр сацыяльнай дапамогі, будаўніцтва якога хутка распачнецца ў Пінску. Тут размесціцца дзіцячы хоспіс, аддзяленне рэабілітацыі, прытулак для старых. Гэтай работай праваслаўныя святары і вернікі займаюцца і зараз, толькі ў розных месцах горада, у розных прыходах. Вялікая ўвага надаецца працы па прафілактыцы абортаў, рабоце з сем'ямі наркаманаў, алкаголікаў, сем'ям, дзе выхоўваюцца інваліды.

Айцец Сергій лічыць, што працаваць трэба не толькі з тымі, хто мае патрэбу ў дапамозе, але і з усімі членамі грамадства: «У жыцці мы часта не заўважаем ні старых, ні інвалідаў, ні нямоглых. Робім выгляд, што гэтых людзей няма побач з намі. У большасці з нас жыве ўстаноўка: дзяржава павінна, урач павінен, школа павінна. А хіба сябе не павінен спытаць кожны, што ён зрабіў для блізкага, для ўсяго свету?» Пераадолець абыякавасць, навучыць адчуваць радасць дапамогі іншаму чалавеку заклікана вось гэтыя сацыяльныя місіі, да якіх царква імкнецца далучыць усё больш моладзі.

Валанцёрскія групы ёсць у Пінскай гімназіі №2, індустрыяльна-педагагічным каледжы, Палескім універсітэце, іншых установах Пінска. Маладыя людзі, якія дапамагаюць старым, інвалідам, ніколі не пакінуць сваіх бацькоў, дзядуляў і бабуль, — выказаў спадзяванне айцец Сергій. Святар нагадаў сваю размову з дырэктарам Пінскага сацыяльнага прытулку для састарэлых. З 19 яго жыхароў 11 на той момант мелі добра забяспечаных дзяцей. «Дзецям у свой час гэтыя людзі далі многае, — з горыччу гаварыў бацюшка, — а ў дзяцей не знайшлося для іх хоць трохі душэўнай цеплыні». Таму і працуюць актыўна прыходы Пінскай епархіі, каб заклікаць людзей сабраць сродкі на цэнтр і тым самым пераадолець абыякавасць нашых грамадзян.



Настаяцель са Святой Волі айцец Мікалай.



Дом міласэрнасці евангельскіх хрысціян-баптыстаў.

### Дом спагады і міласэрнасці

Недалёка ад Пінска, у гарадскім пасёлку Лагішын, каталіцкі касцёл пабудаваў Дом міласэрнасці. Сёння тут жывуць пажылыя людзі ( іх 43) з усіх рэгіёнаў краіны. Цікава, што ў прытулак бяруць не па веравызнанні. Акрамя католікаў, у лагішынскай установе жывуць праваслаўныя, баптысты. Да атэістаў у гэтым доме ніхто сябе не адносіць. У двухпавярховым будынку ёсць капліца, абсталяваная для службы як каталіцкім, так і праваслаўным святаром. У гэтым светлым памяшканні мы сустрэлі дзвюх прыхаджанак. Кацярына, інвалід з дзяцінства, атрымлівае тут душэўную палёгку. А пенсіянерка Ванда, як яна сказала, моліцца за ўсіх маладых. Жанчыны выказалі шчырую падзяку за тыя ўмовы, у якіх яны жывуць, за ўважлівыя адносіны кіраўніцтва і персаналу.

Пакоі Дома міласэрнасці разлічаны на два чалавекі. Раз на тыдзень пажылых людзей аглядае ўрач. Паводле слоў ксяндза Тадэвуша Шашко, жанчыны, што працуюць тут, ставяцца да старых нібы да сваіх бацькоў. Ардынарый Пінскай Дыяцэзіі біскуп Антоні Дзям'янка падкрэсліў, што ўстанова была пабудавана пад патранатам кардынала Казіміра Свёнтка пры дапамозе многіх дабрачынцаў. І цяпер ёсць прадпрыемствы, арганізацыі, прыватныя асобы, якія спрыяюць рублём добрай справе. Але часам бываюць фінансавыя цяжкасці, бо 80% пенсійных адлічэнняў не кампенсуюць кошт пражывання і догляду старых.

Дом міласэрнасці працуе два гады, але ўжо адчуваецца яго ўплыў на светапогляд мясцовых жыхароў. Калі яго будавалі, са смехам успаміналі святары, праезджыя нярэдка пыталі: «Які алігарх тут узводзіць сабе апартаменты?» А цяпер сюды прыходзяць школьнікі з настаўніцай, моладзь праводзіць канцэрты самадзейнасці. Святары ўсіх канфесій наведваюць прытулак з пастырскім словам. Людзі, якія працуюць у Доме міласэрнасці, карыстаюцца нязменнай павагай сваіх аднавяскоўцаў.

### Будучы прытулак

Трэцім пунктам нашага падарожжа была вёска Святая Воля Івацэвіцкага раёна. Мясцовыя жыхары вельмі ганарацца настаяцелем свайго прыхода айцом Мікалаем Ляўшуком. Прыгожы храм са званіцай стаў галоўнай славутасцю гэтых мясцін. А ўзводзілі яго на пачатку 1990-х, калі грошай у прыхаджан зусім не было. І яны ахвяроўвалі... бульбу. Бацюшка збіраў аўтакараваны і накіроўваўся ў Піцер, Мурманск, гарады Балтыі, у залежнасці ад таго, дзе за бульбу можна было выручыць больш. На атрыманыя сродкі куплялі будаўнічыя матэрыялы. Брыгаду цесляроў святар фарміраваў асабіста пасля доўгіх і грунтоўных гутарак з будаўнікамі. Кожнага вопытнага майстра адшукваў па рэкамендацыях. Усе яны на час работы ў Святой Волі ўзялі водпуск на працы. І за пяць тыдняў узвялі не царкву — сапраўдны шэдэўр дойлідства. Пры гэтым штодзень на будоўлю выходзіла да сотні мясцовых жыхароў. І ў 1994 годзе храм Узвіжання Крыжа Гасподняга быў адкрыты.

Таму кожны, хто ведае айца Мікалая, верыць, што задуманы ім дабрачынны прытулак будзе пабудаваны і прыме сваіх насельнікаў. Зараз насупраць храма ў рыштаваннях стаіць ужо трохпавярховы будынак. Закладзены фундамент пад другі, які стане харчовым блокам для людзей, што прыйдуць сюды жыць. У доме маюць намер даваць прытулак тым, хто мае патрэбу ў даху над галавой, кавалку хлеба і слове спагады. Будоўля вядзецца з 2008 года. І даўно была б скончана, каб сродкаў хапала.



Царква ў Святой Волі.

### І старыя, і дзеці

У Кобрынскім раёне аздараўленчы лагер для дзяцей «Жамчужынка» працуе 19-ы год. Яго абсталявалі евангельскія хрысціяне-баптысты ў былой панскай сядзібе, якая доўгі час яшчэ служыла ваеннаму гарадку. У камфортных умовах тут адпачываюць каля двухсот школьнікаў за змену. А за лета ў «Жамчужынцы» папраўляюць здароўе больш за тысячу хлопчыкаў і дзяўчынак з усёй Беларусі. Як падкрэсліў дырэктар установы Уладзімір Вандзіч, лагер прымае дзяцей з дзіцячых дамоў, шматдзетных, праблемных сем'яў незалежна ад веравызнання.

Трохі ў баку ад лагера, каб не парушаць цішыню і спакой, не так даўно вырас будынак Дома міласэрнасці для састарэлых. Тут жывуць 25 чалавек у вельмі камфортных пакоях на аднаго або двух чалавек. Дырэктар установы Ігар Мікляеў паведаміў, што з прэтэндэнтам на месца спачатку заключаецца дагавор на месяц, потым на большы тэрмін. Але, як правіла, бабулі і дзядулі затрымліваюцца тут далей. Праўда, паводле ўмоў дагавора, яны не могуць прадаваць свае дамы або кватэры, бо ўстанова існуе на спонсарскія грошы. І ніхто не можа гарантаваць, што сродкі будуць заўсёды. Таму прадстаўнікі Саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў вельмі прасілі прадстаўнікоў СМІ апеляваць да свядомасці грамадства. Кожная капейка, ахвяраваная на дабрачыннасць, не толькі залічваецца на небе, але і паляпшае душу ахвяравальніка.

### Скіт на хутары Вяжное

Вяжное — гэта ўскраіна Белавежскай пушчы на мяжы Камянецкага і Пружанскага раёнаў. Царква Свяціцеля Мікалая на гэтым месцы была ўзведзена ў канцы васямнаццатага стагоддзя. Але апошнім часам на хутары засталася адна мясцовая жыхарка. Службу час ад часу праводзіў прыезджы святар. Каб ажывіць гэтыя мясціны, сем гадоў таму сюды прыйшлі манашкі жаночага манастыра, які размешчаны ў Брэсцкай крэпасці. У лясную глуш іх прывяло не толькі імкненне адысці ад мірской мітусні, але і пашырыць гаспадарчую дзейнасць. У крэпасці нельга будаваць або трымаць падсобную гаспадарку. Тады, праўда, сёстры і падумаць не маглі, што за нейкую сотню метраў ад скіта пройдзе аб'язная дарога вакол Белавежскай пушчы. Цяпер жыццё тут імкліва мяняецца. Шмат ахвотных з'явілася наведаць старую царкву і крыніцу пры дарозе. У скіт пацягнуліся людзі, якія маюць патрэбу ў душэўнай дапамозе. Тут разгарнулася сапраўдная будоўля. Ігуменя Аляксандра гаворыць, што з Божай дапамогай яна спадзяецца неўзабаве адкрыць багадзельню для адзінокіх жанчын.

❍❍❍

*Усе аб'екты, якія ўдалося наведаць за дзень, існуюць на ахвяраванні спонсараў і вернікаў розных рэлігійных канфесій. Усе яны адкрыты для людзей, якія гатовы дапамагчы. Мудрыя гаварылі: «Кінеш за сабой — знойдзеш перад сабой». Бо ніхто не ведае, што чакае наперадзе кожнага. Ва ўсе з названых дамоў для састарэлых сёння ёсць чарга.*

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара і Валерыя КАРАЛЯ.**
*Пінскі, Івацэвіцкі, Кобрынскі, Пружанскі раёны*

■

# СВОЙ СУПРАЦЬ СВАІХ

**Для зборнай Беларусі па баскетболе наступаюць вызначальныя, гістарычныя дні. Падапечныя Руслана Байдакова пераадолелі кваліфікацыю першынства Еўропы, якое ў наступным годзе прыме Украіна, і цяпер прэтэндуюць на месца сярод лепшых зборных Еўропы. Аднак для таго, каб паехаць на баскетбольнае свята, беларусам неабходна двойчы перамагчы упартую зборную Эстоніі. Што цікава, дапамагаць у дуэлі з прыбалтамі нашым хлопцам будзе… эстонец! І не проста памочнік глаўкама зборнай Беларусі, а сапраўдная легенда тамтэйшага спорту, адзіны эстонец, які ў сваёй кар'еры паспеў пагуляць у НБА. Наш карэспандэнт наведаў у гасцініцы «Юбілейная» Марціна МЮРСЭПА і пагутарыў з ім пра беларускія грошы, эстонскі лікёр і непаўторны амерыканскі баскетбол.**


Марцін Мюурсэп лепш за ўсіх ведае, як трэба гуляць супраць зборнай Эстоніі.

**— Марцін, ваш тэлефон, напэўна, не сціхае ад званкоў эстонскіх журналістаў, бо менавіта з беларусамі ваша родная зборная будзе аспрэчваць квіток на чэмпіянат Еўропы. Як адказваеце на іх пытанні?**

— Кажу, што сёння на паркеце будзе цяжка. Апошнім часам эстонцы паляпшаюць сваю гульню. І гэта пры тым, што рыхтавацца да кваліфікацыі яны пачалі у ліпені, а мы трэніраваліся ўжо з чэрвеня. Зборная Эстоніі — вельмі добры, небяспечны сапернік. Амаль кожны з яе складу можа забіваць трохачковыя кідкі. Мы рыхтуемся да гэтага супрацьстаяння сур'ёзна і цалкам канцэнтруемся на гульні.

**— Цікава, а што ведалі пра нашу зборную да таго моманту, калі трапілі ў яе трэнерскі штаб?**

— Шчыра кажучы, няшмат. Я ведаў ключавых гульцоў: Пашу Ульянка, які гуляў за талінскі «Калеў», Сашу Кудраўцава, Арцёма Парахоўскага і Сашу Пустагвара. Астатніх не ведаў. Праўда, калі я ўбачыў каманды, супраць якіх мы павінны гуляць у адборачным раўндзе (зборныя Славакіі і Венгрыі — **аўт.**), падумаў, што маем шанцы прайсці далей. У нашым калектыве ўсе працуюць добра. Ёсць пэўны малюнак гульні. Зборная добра бяжыць, але мы не павінны быць цалкам задаволенымі сабой. Каманда дэманстравала і вельмі дрэнную гульню ў Славакіі. У таварыскіх матчах таксама не ўсё цудоўна складвалася. Праўда, спадзяюся, Эстонію мы пераможам.

### «Руслана Байдакова перамагаў у настольны тэніс»

**— Між іншым, як з'явіўся ў вашай трэнерскай кар'еры беларускі варыянт?**

— Руслана Байдакова, галоўнага трэнера зборнай Беларусі, я ведаю ўжо даўно. Яшчэ на зборах моладзевай зборнай СССР мы разам дзялілі нумар на базе ў падмаскоўным Навагорску. Памятаю добра тыя гады. У вольны час мы гулялі ў шахматы, пінгпонг. У тэніс я Руслана перамагаў. У мяне была добрая падача, якую ён не мог прыняць,— узгадвае Мюурсэп і характэрным жэстам дэманструе ў паветры рух ракеткай.— Байдакоў, напэўна, лічыць інакш. А яшчэ мы вельмі добра харчаваліся. І калі людзі ежу аплачвалі талонамі, нас частавалі ікрой. Летась у снежні мне патэлефанаваў Руслан і прапанаваў дапамагчы яму ў працы са зборнай. Я прыкінуў, што летам у мяне ёсць некалькі вольных месяцаў, паразважаў пару месяцаў і адказаў: «Добра, працуем!».

**— А ў эстонскую зборную вас не запрашалі?**

— Запрашалі. Толькі гэта было ўжо пасля нашай дамовы з Русланам. Маўляў, можа, не трэба ехаць у Беларусь, далучайся да нас. Але я вырашыў, што больш цікава працаваць мне будзе менавіта ў зборнай Беларусі.

### «У дзяцінстве я быў неблагім футбольным варатарам»

**— Марцін, дзесьці вычытаў, што ваш спартыўны шлях у Таліне пачаўся з футбола.**

— Гэта было ў дзяцінстве. Сям'я не была спартыўнай. Бацька калісьці трохі займаўся боксам. У нашых дваровых футбольных гульнях я быў неблагім варатарам, але потым, ужо ў секцыі, добра гуляў і ў атацы. Неяк за тры гульні наша каманда забіла двойчы, і ўсе трапныя ўдары выканаў менавіта я.

**— Аднак галоўных поспехаў у жыцці вы дасягнулі менавіта ў баскетболе. Прызнайцеся, з вашым высокім ростам у маладосці таксама было складана?**

— Было. Цяпер усё прасцей: можна і столь дома вышэй зрабіць, і машыну больш прасторную набыць. А раней і ў самалётах было нязручна. Ніколі не любіў спаць у ложках, дзе ў нагах зроблена спінка. Гэта проста немагчыма для ног! А вось у Навагорску мы спалі наогул на трохметровых ложках, на якіх у свой час адпачывалі Арвідас Сабоніс і Уладзімір Ткачэнка.

**— Як у той час успрынялі развал Саюза?**

— Гэта быў вельмі цяжкі момант для маёй спартыўнай кар'еры. Я ўжо паспеў тады пагуляць за моладзевую зборную СССР на чэмпіянаце Еўропы, аднак наперадзе нас чакалі вялікія турніры. У наш «Калеў» мяне не ўзялі. Паехаў на падпрацоўку да сястры ў Швецыю. Паралельна вучыўся у школе, а пасля трапіў у стакгольмскую каманду «Алвік». Затым у маёй кар'еры быў ізраільскі «Макабі», зноў родны «Калеў». Ужо потым я трапіў у НБА. Між іншым, савецкая зборная дапамагла мне паверыць у сябе. Я ведаў, верыў у тое, што магу паехаць за акіян. У сваю чаргу, мой агент таксама казаў мне, што мной цікавяцца вялікія клубы з Еўропы і ЗША. Мая амерыканская кар'ера больш запомнілася па матчах за каманду «Далас Маверыкс». Раней гуляў за «Маямі». Быў маладым, крыху нахабным хлопцам. Калі мне нешта не падабалася, дэманстраваў тое, што хачу гуляць. Праўда, калі трэнеры бачаць тваю незадаволенасць, можна лёгка вылецець з каманды. За табой заўсёды ёсць вялікая чарга! Напэўна, менавіта з-за гэтага мяне абмянялі ў «Далас».

**— Дарэчы, у «Маямі» з вамі працаваў Пэт Рэйлі — адзін з найбольш таленавітых трэнераў НБА, стыляга, які выключна носіць касцюмы ад «Армані».**

— Так, а яшчэ ў рэстаране ён ніколі не глядзіць у меню, а замаўляе тое, што любіць. Ён вельмі ўдачлівы трэнер. Па вялікім рахунку, дрэнныя спецыялісты там не працуюць. У ЗША любяць казаць, што НБА — гэта вялікая сям'я. Але гэта не сям'я, а вялікі бізнес. Калі трэнеру нешта не спадабаецца, ён памяняе цябе, як шахматную фігуру. Яго не хвалююць твае асабістыя пытанні. Ён проста імкнецца якасна выконваць сваю працу.

**— Вы памятаеце свае тагачасныя мары?**

— Калі яшчэ не трапіў у Амерыку, мне вельмі хацелася згуляць супраць легендарнага харвацкага баскетбаліста Дражэна Петравіча. І я паўдзельнічаў у апошнім яго матчы. У 1993 годзе зборная Эстоніі ў Польшчы гуляла супраць харватаў у кваліфікацыйным турніры да першынства Еўропы. Памятаю, як падчас сустрэчы я перахапіў у Петравіча мяч і, закінуўшы яго ў карзіну, прынёс сваёй камандзе два ачкі. У мяне гэты момант нават на відэа захаваўся! Праўда, пра некалькі секунд ён балюча ўдарыў мяне локцем у жывот (нават сіняк з'явіўся) і паклаў мяч ужо ў наша кольца. На наступны дзень зборная Эстоніі вярталася ў Талін, а я ляцеў у Ізраіль. Сустрэў у аэрапорце і харвацкіх хлопцаў. Петравіча сярод іх не было. І ўжо тады, калі прыляцеў у Тэль-Авіў, даведаўся, што Дражан загінуў у Германіі ў аўтакатастрофе. Я быў шакіраваны.

**— А як жа гульні супраць непаўторнага Майкла Джордана?**

— Я так і не здолеў супрацьстаяць яму на пляцоўцы. Помню, як сядзеў на лаўцы «Маямі» і назіраў за тым, як ён нашай камандзе закідвае мячы адзін за адным — увогуле больш за 50 ачкоў. Уявіце, гэта было ў першым матчы сезона 1996 года.

**— Марцін, за вашу багатую кар'еру вас 7 разоў прызнавалі лепшым баскетбалістам Эстоніі.**

— Сапраўды? Я гэтага не ведаў.

**— Хіба гэта няшмат?**

— Не, можна было і больш.

**— Шматлікія баскетбольныя званні маюць для вас значэнне?**

— Заўжды прыемна атрымліваць узнагароды. Шмат маіх прызоў у сябе захоўвае маці. Імкнецца трымаць іх у пэўным месцы. Губляць нічога нельга, бо кожная медаль мае вялікае значэнне для мяне.

### «Галоўнае маё глупства — набыццё «Хамера»

**— На якіх мовах вы можаце лёгка размаўляць, напрыклад, з прадаўцом у краме?**

— Па-руску, на іўрыце, пашведску, на фінскай мове, па-англійску і па-грэчаску. Наогул у мяне ёсць здольнасці да вывучэння моў. Калі б не баскетбол, напэўна, працаваў бы гідам. Аднак лепш за іншыя замежныя мовы я ведаю англійскую. Зараз амаль паўсюдна праца ў клубах вядзецца на англійскай мове. Так было нават у казанскім УНІКСЕ. У Беларусі мая руская мова палепшала, але ўсё роўна, калі ехаў сюды, хваляваўся за свае навыкі.

**— Пасля доўгіх пераездаў вы зноў жывяце і працуеце ў Эстоніі. Для большай часткі жыхароў постсавецкіх рэспублік яна асацыюецца з лікёрам «Вана Талін», спевакамі Урмасам Отам і Тынісам Мягі.**

— Мне не падабаецца «Вана Талін». Але, калі гуляў у Расіі, я часта браў яго з сабой, каб пачаставаць сяброў. Тыніс Мягі і сёння папулярны спявак. А вось Анне Вескі, напэўна, была больш вядомая ў Савецкім Саюзе, чым у сучаснай Эстоніі. Але яна ўсё роўна наша «зорка».

**— Я чуў, што вы неяк раней ездзілі на «Хамеры». Напэўна, раскоша, а не машына.**

— Гэта самае вялікае глупства ў маім жыцці! Аддаў за яе прыкладна 100 тысяч долараў. Унутры няма месца, яе цяжка прыпаркаваць. Карацей, прадаў яе толькі сёлета, а так на ёй збольшага каталіся мае сябры. Цяпер у мяне сціплы аўтамабіль.

**— Менавіта сёлета вы прыехалі працаваць у нашу краіну.**

— Мяркую, раней я ніколі не быў у Мінску. Ён выглядае чыстым і прыгожым горадам. Гэта тычыцца і Ліды, і Маларыты, дзе мы былі на зборах. А вось з беларускімі грашыма ў мяне праблемы нават зараз. Паперы вельмі шмат. Статысячная купюра вельмі падобная да двухсоттысячнай. Мне здаецца, я часам памыляюся, калі расплачваюся на касе. Ды і аддаваць купюру ў 10 тысяч за бутэльку мінеральнай вады мне неяк неахвота.

**— У Мінску паспелі і на хакей схадзіць?**

— Так,— кажа Марцін і папраўляе на галаве бейсболку з дынамаўскім лагатыпам.— Калі прыходжу на якую-небудзь гульню, мне хочацца «хварэць» за каманду, і тады я набываю нешта з атрыбутыкі. Бейсболак у мяне розных хапае. Ёсць і з ЗША — з Нью-Ёрка. Таксама маю футбольную майку нашага футбаліста Ёэля Ліндперэ, які гуляў за «Нью-Ёрк Рэд Булз», а цяпер выступае за каманду з Чыкага. Мы з ім сябруем, жывём непадалёк адзін ад аднаго. Шмат разоў лятаў «хварэць» за яго ў Штаты. Цяпер, калі б не праца, напэўна, таксама быў бы ў Амерыцы. Яэль тэлефануе, трымае кулакі за нас. Званіў мне пасля апошняй гульні са Славакіяй і віншаваў нашу каманду з перамогай. Зараз Беларусь будзе гуляць супраць Эстоніі. Хто ведае, магчыма, і гэтым разам ён будзе за мяне перажываць.

…У сваю чаргу, нам застаецца дадаць, што сённяшні матч адбудзецца ў магілёўскім спарткомплексе «Алімпіец». Пачатак гульні ў 19:00.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
**Фота аўтара**
**і з уласнага архіва М. Мюурсэпа.**

## ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

*Марцін Мюурсэп нарадзіўся 26 верасня 1974 года ў Таліне. Рост — 208 см. Выступаў за «Калеў», «Тарту Рок», «Ракверэ Тарвас» (Эстонія), «Алвік» (Швецыя), Макабі (Тэль-Авіў, Ізраіль), «Маямі Хіт», «Далас Маверыкс» (ЗША), «Арыс», АЕК (Грэцыя), УНІКС, «Дынама» (Масква), «УРАЛ-Грэйт», ЦСКА (Расія), «Мельбурн Тайгерс» (Аўстралія). З 2010 года памочнік галоўнага трэнера каманды «Калеў» (Эстонія). З лета 2013 — асістэнт глаўкама зборнай Беларусі. У НБА правёў 83 гульні. 7 разоў прызнаваўся лепшым баскетбалістам Эстоніі. Чэмпіён Расіі ў складзе маскоўскага ЦСКА (2004/05).*


Адзін з улюбёных здымкаў Мюрсэпа. 1997 год, матч рэгулярнага сезона паміж «Даласам» і «Х'юстанам» у Мехіка наведалі 20 тысяч гледачоў.

# У рэгіёнах абвешчаны ВЕЛАБУМ!

**Толькі паспеў мэр Мінска заявіць пра чарговы план развіцця веласіпеднага руху ў сталіцы, сайты навін і форумы пачалі перапаўняцца каментарыямі кшталту: «Дык тое ж Мінск…». Расчараванне іншагародніх аматараў двухколавага транспарту можна зразумець. Калі ў сталіцы і абласных гарадах ёсць неблагія ўмовы для велаадпачынку, то раённыя цэнтры, нават самыя буйныя, не могуць пахваліцца добрай інфраструктурай. У заняпадзе ў рэгіёнах знаходзіцца не толькі аматарскі, але і прафесійны веласпорт. Пра гэтыя і іншыя праблемы мы пагутарылі з былым велагоншчыкам, алімпійскім чэмпіёнам 1976 г. у камандная гонцы, а сёння членам Мінскай абласной федэрацыі веласіпеднага спорту Уладзімірам КАМІНСКІМ.**



«Сапраўды, у Мінску веласіпедны рух зараз у прыярытэце, а вось у раёнах з гэтым праблемы,— пагаджаецца Уладзімір Уладзіміравіч.— Па ўсёй вобласці магчымасць займацца веласпортам ёсць толькі ў Крупках, дзе працуе філіял Рэспубліканскай ДЮСШ прафсаюзаў па веласпорце, і ў школе ад Мінспорту ў Маладзечне. Але, на жаль, забяспечанасць гэтых устаноў вымушае жадаць лепшага. З-за адсутнасці інвентару тамтэйшыя выхаванцы, па сутнасці, займаюцца выключна агульнай фізічнай падрыхтоўкай».

Таму абласная федэрацыя веласпорту распрацавала праграму велафестываляў у дробных населеных пунктах, каб дзяўчынкі і хлопчыкі з самых невялікіх вёсак мелі магчымасць хаця б проста навучыцца ездзіць на веласіпедзе. У Мінскай вобласці 22 раёны, і ў кожным з іх ад 16 да 22 пасялковых саветаў. Безумоўна, адразу ахапіць увесь маштаб нерэальна, але пастукова развіваць гэтую праграму магчыма.

«Веласпорт — адзін з нямногіх відаў спорту, якія маюць прыкладное значэнне,— працягвае праслаўлены спартсмен.— Бо гэта і звычайная падтрымка фізічнай формы, і хобі, і папулярны сродак перамяшчэння. Нездарма ЮНЕСКА прызнаў веласіпед самым распаўсюджаным відам транспарту. А між тым, ездзіць на ім трэба правільна! І перш за ўсё я маю на ўвазе не спецыяльныя навыкі, а элементарнае веданне правілаў дарожнага руху».

Па меркаванні нашага суразмоўцы, велафестывалі ў сваёй праграме могуць спалучаць як навучальныя конкурсы, так і асветніцкія размовы наконт правілаў дарожнага руху. А яшчэ плюс у тым, што правядзенне мерапрыемства не патрабуе абавязковай наяўнасці спартыўных аб'ектаў. «Калі выказвацца тэрміналагічна, спартыўным ядром можа паслужыць звычайная пасялковая дарога, неабавязкова нават асфальтаваная,— запэўнівае алімпійскі чэмпіён.— Умоўна кажучы, узяць адрэзак дарогі, паставіць фішкі, паказаць дзецям элементарныя фігуры і арганізаваць конкурс у розных дыстанцыях і ўзроставых катэгорыях».

Свой старт праект узяў у маі, калі ў Рудзенску адбыўся першы падобны велафестываль. Але не ўсё прайшло гладка: «Сутыкнуліся з праблемай — не ва ўсіх сем'ях ёсць веласіпеды. Таму неабходна шукаць спонсараў сярод айчынных вытворцаў велатэхнікі — напрыклад, «Аіст». Добра, калі ў кожным пасёлку будзе хаця б пяць «нейтральных» веласіпедаў».

Але Уладзімір Уладзіміравіч кажа, што і гэта не асноўная цяжкасць. Не так лёгка заручыцца падтрымкай мясцовай улады і знайсці неабыякавых людзей, здольных дапамагчы ў арганізацыі мерапрыемства. «Мы не патрабуем абавязкова адкрываць у кожнай школе секцыі веласпорту! Гэта можа быць штосьці кшталту грамадскага аб'яднання, дзе ў якасці трэнераў маглі б працаваць настаўнікі фізкультуры ці валанцёры. Напрыклад, у Мар'інай Горцы ў нас ёсць адзін актывіст — Уладзімір Віктаравіч Мацулевіч. Звычайны пенсіянер, які зараз працуе ў домаўпраўленні. Калісьці скончыў інстытут фізкультуры, працаваў настаўнікам у мясцовай школе і вось зараз на дабрачынных пачатках працягвае займацца з дзецьмі. То каток зал'е зімой, то сетку валейбольную купіць, а цяпер дапамагае нам у арганізацыі велафестываляў. Вось такія людзі нам патрэбны!».

На пытанне «Што далей рабіць з дзецьмі, якія сапраўды захапіліся веласпортам?» у былога велагоншчыка таксама ёсць адказ: «Для тых, хто будзе паказваць неблагія вынікі і мець жаданне займацца далей, мы прапаноўваем арганізаваць летнія велалагеры, куды можна запрашаць вядучых трэнераўселецыянераў. З гэтым праектам мы ўжо звярнуліся ва ўпраўленне фізічнай культуры, спорту і турызму Мінскага аблвыканкама. Але чакаем адказу з лютага. Наступная калегія адбудзецца ў верасні. Паглядзім — мабыць, штосьці вырашыцца».

Не абмінулі мы і пытанне развіцця веласіпеднай інфраструктуры ў раёнах. Уладзімір Уладзіміравіч лічыць, што пры мінімальных намаганнях і затратах становішча можна і трэба паляпшаць: «Прывяду прыклад. Зараз актыўна развіваецца такая алімпійская дысцыпліна, як ВМХ (**прым. аўт.**— веласіпедны мотакрос). Але пляцовак для гэтага экстрэмальнага віду спорту ў нас амаль няма. Хаця, па сутнасці, для гэтага патрэбныя толькі невялікі кавалачак поля, зямля і трактар, каб сфармаваць фігуры — разнастайныя узгоркі, насыпы і трампліны. Гэтымі пытаннямі зараз займаецца Мінскі гарадскі цэнтр алімпійскага рэзерву па веласіпедных відах спорту. Але зноў гэта сталіца, а што ў рэгіёнах? Тым часам штодзень па ўсёй краіне тоны будаўнічага пяску звозяць у кар'еры. А з ім столькі ўсяго можна было б зрабіць!».





Аказваецца, веласіпедны «бум» мог бы пачацца яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму. «Пракласці веладарожкі ў Мінску мы прапаноўвалі яшчэ ў пачатку 1980-х,— прызнаецца Уладзімір Уладзіміравіч.— Але хто ж нас слухаў! Чулі ў адказ: «Якія веладарожкі? Нам на звычайныя дарогі грошай не хапае. Але, ведаеце, справа не ў сродках — светапогляд быў іншы, не падрыхтаваны яшчэ да такіх змяненняў. А цяпер — самы час! Трэба спяшацца, мы і так спазняемся».

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**
**Фота БЕЛТА**

■ Захапленні

## ПЕЙНТБОЛ-ЭКСТРЫМ

